незалежная газета

№ 48 (598) 29 снежня 2008

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацвяргі

## Шляхі ў Гуантанама ішлі праз Мінск-2

Старонка 6



## Выкраданне Артура Фінькевіча

Старонка 12




## Тэлепраграма «Белсату» на тыдзень

Старонка 23

### У НУМАРЫ

**Масква словам не верыць**

Умова выдачы другой траншы — падпісанне Беларуссю мемарандуму аб допуску ў краіну расійскага капіталу. **Старонка 5.**

**АЭС на Нарачы збудуе Расія**

«Росатом» стане генеральным падрадчыкам. **Старонка 5.**

**Лоўкасць рук нацыянальнай статыстыкі**

альбо Паскарэнне на фоне запавольвання. Піша эканаміст Аляксандр Чубрык. **Старонка 7.**

**Бунт полацкага бізнэсоўца**

Уладзімір Захараў два дні трымаў зачыненымі гандлёвыя дамы ў Полацку і Наваполацку. **Старонка 7.**

**Каляндар-2009**

Юбілеі наступнага году. **Старонка 13.**

**Задала «Тройца» жару ў «Казе»**

25 снежня этна-трыа прэзентавала свой новы альбом. Як і абяцалі — з сюрпрызамі. **Старонка 9.**

**Залатая гірлянда для дзяцей Нікарагуа**

Таццяна Рабушка. Каляднае апавяданне. **Старонка 18.**

# Здароў, 2009-ы!

Што там, у новым годзе?


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Вынікі году

**Асобы году:**
Ганчарэнка, Ірына Казуліна, Макей, Коля... 3
**Культура:**
Круглыя даты і культурныя страты 9
**Фотарэпартаж:**
Журавіны 10
**Спорт:**
БАТЭ. Кулісы феномену 16
**Музыка:**
Год «Ляпісаў» 17
**Кніга году:**
Галасы з-за небакраю 19

# Кніга году 2008

Рэйтынг «НН».

Беларуская літаратура заложна ўрастае ў сусветную, а тая, рашуча прашыўшы моўныя перапоны, ужываецца ў тканку беларускай. Сёлетнюю дзесятку найлепшых узначальвае кніга перакладаў замежнай паэзіі.

Сёлета выйшла шмат якаснай літаратуры. Як адзначыла пісьменніца Людміла Рублеўская: «Пачала згадваць цікавыя выданні 2008 году — спісала цэлую старонку, і з прыкрасцю зразумела, што выбіраць давядзецца найлепшае з такога ж найлепшага. У запаветную «дзясятку» не далося пісаць ніводнага навукова-папулярнага выдання ці альбому кшталту «Калекцыйная спадчына Вялікага Княства» — столькі сёлета выдатнай паэзіі і прозы».

Са свайго боку гісторык з Гродна Андрэй Чарнякевіч уважае, што «гэта быў цалкам неблагі — як на цяперашнюю рэчаіснасць — год для гістарычнай кнігі».

**Працяг на старонцы 19.**

# Супакой на зямлі


Юлія Дарашкевіч

**Калядны зварот духоўнага лідэра беларусаў замежжа, апостальскага візітатара для беларусаў-каталікоў замежжа айца Аляксандра Надсана.**

Недзе 20 гадоў таму Папа Ян Павал II склікаў у Асізі, горадзе святога Францішка, прадстаўнікоў усіх рэлігіяў, каб памаліцца за супакой на свеце. У прывітальным слове Папа зазначыў, што ўсе рэлігіі, не толькі хрысціянская, сведчаць пра найвышэйшую духоўную рэальнасць, якая пераўзыходзіць рамкі гэтага бачнага свету. Далей, аднак, Папа прадаўжаў: «Сказаўшы гэта, я павінен з пакораю сцвердзіць, што імя супакою — Ісус Хрыстос».

Міжволі прыгадваецца беларускі святар Кастусь Стаповіч, ён жа паэт Казімір Сваяк, які 60 гадоў раней, у 1925 годзе, за некалькі месяцаў да сваёй передчаснай смерці ў вершы «Веру не розуму проці» з вялікай сімпатыяй, разуменнем апісаўшы раней-шыя, дахрысціянскія вераванні беларусаў, што жылі ў народных абрадах Радаўніцы, Купалля, Дзядоў, Калядаў скончае наступным чынам:

«А Хрыстос дзе?» — пытаеш ты з
усмешкай,
Бо не відаць, дзе Ягонае месца тут.

І адказвае:

Не будзе, не! — Сын Божы нам
замешкай,
Бо толькі Ён вядзе ў Абсалют,
Бо толькі Ён і Праўда, і Дарога,
Жыцця бяду й смерць Ён зваяваў.
І толькі Ён пазнаў самога Бога,
І свету від Ягоны паказаў.

Сказанае Янам Паўлам II і Сваяком пераклікаецца са словамі святога Апостала Паўла, які пісаў: шматразова і рознымі спосабамі некалі Бог прамаўляў да айцоў праз прарокаў, а ў канцы прамовіў да нас праз Сына, Якога ўстанавіў спадкаемцам усяго і праз якога вякі стварыў.

Вось тры сведчанні пра Ісуса Хрыста, як пра аб'яўленне Бога і дарогу да жыцця. Ян Павал II атаясамлівае Яго з супакоем. Часта для нас супакой азначае адсутнасць якой-колечы дзейнасці, але гэта не сапраўдны супакой, гэта супакой магільны, запярэчанне жыцця.

Сапраўдны супакой — гэта жыццё, гэта гарманічнае развіццё нашых духоўных магчымасцяў дзеля асягнення апошняй і адзінай мэты — Бога, крыніцы жыцця, згодна са словамі святога Аўгустына: «Стварыў Ты мяне, Божа, і неспакойна сэрца маё, пакуль не спачне ў Табе».

Згодна з евангельскім апаведам, пры нараджэнні Хрыста былі чутны спеў на небе: «Слава на вышынях Богу, супакой на зямлі, добрая воля сярод людзей».

Сапраўдны супакой магчымы толькі пры наяўнасці добрай волі, гэта значыць, пачуцця добразычлівасці да іншых, жадання дабра ўсім. Без яе можам мець у найлепшым выпадку вонкавы парадак, заснаваны на сіле і страху, а дзе сіла і страх, там ужо адзін крок да злосці і нянавісці, якія супярэчаць супакою і з'яўляюцца прычынай нашых няшчасцяў. Дык у гэты дзень, калі мы ўспамінаем прыйсце на свет Сына Божага, будзем маліць Яго, каб Ён у сваёй дабрыні даў пасяліцца ў сэрцах нашых Ягонаму супакою, што перавышае ўсякае ўяўленне і з'яўляецца асноваю сапраўднага шчасця, як асабістага, так і грамадскага.

Жадаю ўсім правесці добра Святыя Каляды і спаткаць Новы год!

**Айцец Аляксандр Надсан,**
**Лондан 2008**

**Андрэй Хадановіч**
(нар. 1973) — паэт, аўтар кніг «Бэрлібры», «Сто лі100ў на tut.by». Старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтру. Зняміў стэрэатыпы пра беларускую паэзію.

# Шчодры вечар

**Андрэй Хадановіч**

Вечар на мытні. Каталікі п'юць заварку.
На ўкраінскай, вядома, сідаюць йісты.
На беларускай, магчыма, кульнулі чарку.
Добра ім, бульбашам, яны атэісты.

Снег на заставах такі ж, як у Вільні й Рызе.
Зорнае неба гоніць думкі аб хлебе.
У Еўразвязе эканамічны крызіс:
эканомяць святло — і зоркі відаць лепей.

Трое бадзягаў. Два з візамі, трэці без візы.
Твары такія, што можна крычаць: «горка!»
Кажуць, па Еўраньюс выступалі ганцы з Пізы,
быццам на ўсход ад шэнгену гарыць зорка.

Пенсіянер-фальксваген — нібы вярблюд аднагорбы.
Фотаробат кіроўцы вядомы мясцовым уладам.
На рухомую стужку складаюць свае торбы.
На маніторы ў мытніцы: золата, смірна, ладан.

Першы з пакетам прэзентаў. На пакеце багоўка.
Ясна, што з беластоцкага супермаркету. Пагаварым-с?
Пан Бальтазарскі Караль, дзе ваша страхоўка?
— Мэта паездкі?
— Пішыце «зорны турызм».

Вы, Мельхіёрас Валхваўскас, пачаму без
візы? Па ксераксе?! Групавой?!! Трохгадовае даўніны?!
Хто падпісаў дазвол? Генерал-лейтэнант Анубіс?
Так, харэ выдурняцца. Ну вы й звіздуны!

Раптам: «Здароў, Каспяровіч! Зямляк. З-пад Валожына.
На Каляды дадому — у нашым стылі!»
Тут здараецца цуд, хоць і не паложана:
ўсіх траіх — нават лабаса — прапусцілі.

Раджаство ў Беларусі? Будуць прыгоды на сраку вам —
падарунак для мага. (Валхва? Караля? Звіздуна?)
Недзе над Ракавам
вернікам і абыякавым,
нібы зорка з ялінкі, свеціць яна.


## Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю

Мы рэкамендуем і просім чытачоў падпісвацца праз Рэдакцыю. Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

1. Яна нам выгаднейшая фінансава.

2. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

3. Лічым важным захаваць сістэму самараспаўсюду дзейнай. Лішне тлумачыць, чаму.

Цана падпіскі праз Рэдакцыю **10 000 руб. на месяц**.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 12 000 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка 3012 206 280 014 Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 10 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


Тры гады «НН» можна было атрымаць толькі падпісаўшыся праз Рэдакцыю. І мы завялі традыцыю дзякаваць усім тым чытачам, якія пералічалі грошы на выхад газеты.

## Дзякуй

**Э.Д., А.С.** з Мінскага раёна.
**С.А.** з Магілёва.
**Яўгенію Л., Сяргею Т.** з Лідскага раёна.
**Іне П.** з Пухавіцкага раёна.
**А.А.** з Полацка.
**Наталлі Т., Андрэю Л., Мікалаю Ш.** з Салігорскага раёна.
**Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёна.
**П.Б.** з Брэста.
**Анатолю Б.** з Маладзечанскага раёна.
**Вячаславу К., Іне С.** з Барысаўскага раёна.
**А.Р.** з Шаркоўшчынскага раёна.
**Аляксандру Б.** з Капыльскага раёна.
**Сяргею К.** з Чашніцкага раёна.
**Алене Б., Аркадзю М., І.Р.** з Гомеля.

# Асобы году

## Чалавек году: Віктар Ганчарэнка

Беларус, ён які? А такі як Віктар Ганчарэнка — грунтоўны, узважаны, валявы. Спакойны, удумлівы, дысцыплінаваны.

Хойніцкі, мележаўскі тыпаж гэты Ганчарэнка. 31-гадовы трэнер БАТЭ нарадзіў новую беларускую легенду. Фантастычны ўзлёт барысаўскай каманды ў Лігу чэмпіёнаў быў заслугай унікальна маладога (тры гульцы каманды старэйшыя за яго) трэнера. Заслужыў годнасць чалавека году ў Беларусі.





PHOTOBYMEDIA.NET

**Віктар Ганчарэнка**

нарадзіўся ў 1977 у Хойніках Гомельскай вобласці. Гадунец хойніцкай спартовай школы і сталічнай Рэспубліканскай вучэльні алімпійскага рэзерву (РВАР). Выступаў за РВАР (1995—1997) і БАТЭ (1998—2002). Абаронца. Двухразовы чэмпіён Беларусі (1999, 2002). Кар'еру гульца завяршыў праз сур'ёзную траўму — разрыў крыжападобнай звязкі, меніск. У час выступлення за БАТЭ здымаў кватэру разам з варатарам нацыянальнай зборнай Юр'ем Жаўновым.

Адукацыя вышэйшая. У 2004 скончыў Беларускую акадэмію фізічнай культуры (трэнер па футболе). У 2004 — 2006 працаваў трэнерам дублюючага складу БАТЭ. З лістапада 2007 — галоўны трэнер БАТЭ.

Жанаты, выхоўвае сына Арцёма, якому крыху больш за год. Маці і сястра жывуць у гарадскім пасёлку Акцябрскі, што на Гомельшчыне. Бацька, які працаваў у Чарнобылі ў першыя дні пасля аварыі, памёр у 1993, пахаваны ў Хойніках. Ганчарэнка кажа, што менавіта бацька прышчапіў яму любоў да футболу.

Любімыя клубы — «Манчэстэр Юнайтэд», «Вільярэал», «Мілан». Любімыя трэнеры — Фабіё Капэла, Алекс Фергюсон, Арсен Венгер.

Ганчарэнка стаў самым маладым трэнерам у гісторыі Лігі чэмпіёнаў. Кажа, што перад стартам Лігі чэмпіёнаў хваляваўся менней, чым перад вяселлем.

Хобі — Формула-1. Любімы гоншчык — Хэмілтан. Любімая каманда — «Макларэн».

Музыка — ніякіх перавагаў не мае.

## Пераразмеркаванне году: Уладзімір Макей і Віктар Шэйман

У 2008 годзе Беларусь атрымала новага шэрага кардынала. А разам з ім — новы афіцыйны курс. На пасадзе кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта страшнага Віктара Шэймана змяніў Уладзімір Макей. Які з усіх сілаў імкнецца падавацца нястрашным і увасабляць курс беларускай улады на лібералізацыю і прымірэнне з Еўрасаюзам. Што немалаважна — Макей часцяком фігуруе на фотах побач з Віктарам Лукашэнкам.

Таксама з блізкага атачэння Аляксандра Лукашэнкі выбылі многія прадстаўнікі старой гвардыі — Генадзь Нявыглас, Алег Праляскоўскі. Змянілі мулкія крэслы старшыняў аблвыканкамаў на сінекуру ў палаце прадстаўнікоў і нацыянальным сходзе Андрэйчанка і Батура.

Фармальна ястраб Шэйман паляцеў за тое, што не ўпільнаваў выбуху на Дзень Рэспублікі. Аднак збоку той выбух выглядае як зручная нагода. Шэйман падазраецца ў датычнасці да знікненняў апанентаў улады. Ён застаўся ў спісе невыязных у краіны Еўрасаюзу нават пасля адмены санкцый. Такі чалавек ой як не трэба цяпер Лукашэнку на заўважнай пасадзе.

## Сыход году: Ірына Казуліна

Лёс гэтай жанчыны стаў увасабленнем той крыжовай дарогі, якой ідуць сваякі беларускіх палітвязняў. Чуткі пра яе цяжкую хваробу з'яўляліся даўно. Але ніводным публічным жэстам Ірына Казуліна іх не пацвярджала. Інфармацыя прыйшла з іншага боку. Падчас аднаго з выступаў Лукашэнка заявіў, што прапаноўваў палітвязню Аляксандру Казуліну вызваленне ў абмен на выезд з краіны ў Нямеччыну: «Ягоная жонка хворая, і да мяне звярнуліся паслы Еўрасаюзу. Я згадзіўся: хай вязе, лечыць жонку. Але наколькі я быў інфармаваны, ён адмовіўся яе лячыць. ...Ён адмовіўся нават пасля таго, як ягоныя дочкі паехалі і ўгаворвалі ўратаваць маму, яму гэтая мама ўжо даўно не была трэба...»

Ірына Казуліна, якая на той час ужо не магла гаварыць, знайшла сілы адказаць адкрытым лістом. «Зачапіла за жывое грэблівае стаўленне да нашай сям'і. Хоць часам здаецца, што нічога падобнага ўжо не можа вывесці з сябе, цынізм дзівіць. Тыя прапановы, якія былі агучаныя яго пасланцам нам, былі непрымальнымі. Гэта было б ганебнымі ўцёкамі з краіны».

23 лютага, праз тыдзень пасля выступу кіраўніка краіны, Ірына Казуліна памерла ад раку малочнай залозы. Адміністрацыя калоніі доўга не хацела выпускаць А. Казуліна на пахаванне жонкі. Але лёс пакутніцы-жанчыны абудзіў такую хвалю грамадскага спачування і абурэння, што ўлады ўрэшце былі вымушаныя адшкадаваць палітыку тры дні адпачынку. Развітацца з Ірынай у Чырвоны касцёл і на магілкі ў Тарасава прыйшлі некалькі тысяч чалавек.

## Пробліск году: Міхась Пашкевіч

У краіне з'явіўся новы энергічны палітык. За год лідэр «Маладых дэмакратаў» Міхась Пашкевіч прайшоў праз крымінальны суд у «Працэсе чатырнаццаці», выключэнне з апошняга курсу гістфаку БДУ (яму заставалася толькі абараніць дыплом), адсядзеў агульнай колькасцю 37 сутак адміністрацыйнага арышту. Нават прысуд на два гады «хатняй хіміі» кранатыву ў Пашкевіча не адняў. Прыкінуўшыся бээрэсэмаўцам, ён пранік на з'езд «лукамолу» і, дабіваючыся слова, узняў там хай падчас выступу віцэ-прэм'ера Косінца. Няўрымслівы Міхась Пашкевіч выглядае адным з найбольш перспектыўных палітыкаў новай генерацыі. Абы не перагарэў, як ужо часта бывала з «маладымі ды раннімі».

## Грымёр году: лорд Бэл

Хто можа навучыць падабацца Захаду, калі не стопрацэнтны яго прадстаўнік? Кіруючыся, відаць, гэтай логікай адміністрацыя Лукашэнкі заключыла кантракт з вядомым англійскім піяршчыкам Цімаці Бэлам. Яго кліентамі былі расійскі алігарх Барыс Беразоўскі, экс-прэм'ер Тайланду Таксын Чынаўат, а таксама манархія Саудаўскай Аравіі. Бэл таксама быў дарадцам прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Маргарэт Тэтчэр.

Год працы не мінуў дарма. Інтэрв'ю з Лукашэнкам з'явіліся ў найбуйнейшых газетах Еўропы і ЗША. Дарэчы, менавіта Бэл за некалькі дзён да вызвалення Казуліна, Кіма і Парсюкевіча заявіў, што на волю выйдуць палітвязні.

Другой найважнейшай задачай брытанец называў правядзенне парламенцкіх выбараў. Тут дэмакратычныя дэкарацыі рухнулі. Аднак Еўропа ўсё настроеная працягваць дыялог. І тут заслуга Бэла, безумоўна, ёсць. Адно што ўлада пільна сочыць, каб Бэлава навука рабіць добрую міну не стала сапраўднай мінай, закладзенай пад «стабільнасць» і «працвітанне».

## Птушка году: Міхаіл Снягір

Катэджы будавалі ўсе, а крайнім застаўся Снягір. Пракурор Мінскай вобласці стаў галоўнай ахвярай антыкарупцыйнага дакладу Лукашэнкі 13 лістапада. Прэтэнзіі былі выказаныя да набытай пракурорам кватэры ў цэнтры Мінску, а таксама катэджу, які выглядае «больш унушальна за рэзідэнцыю прэзідэнта». За карупцыйнымі правамі ў самым сэрцы вертыкалі праглядаюцца даўнія і цёмныя сплецені інтарэсаў. У 2000 годзе пастанову аб арышце Дзмітрыя Паўлічэнкі падпісаў менавіта намеснік генеральнага пракурора Міхаіл Снягір. А бедны чалавек, якога Снегір выселіў з кватэры, як аказалася, — уладальнік заводаў, газет, параходаў...

**Працяг на старонцы 4.**

# Асобы году

Працяг са старонкі 3.

### Прызыў году: Зміцер Жалезнічэнка, Алесь Каліта...

Яшчэ расійскі царызм практыкаваў здачу палітычных актывістаў у салдаты. Сёлета у боты масава абувалі сяброў «Моладзі БНФ». У войска забралі несправядліва адлічанага гомельскага студэнта Зміцра Жалезнічэнку, Алеся Каліту, Зміцра Бяляева, Юр'я Дашука, Хведара Чаранкова. Прызыў-2009 таксама абяцае быць багатым. На чарзе Франак Вячорка, а таксама адзін з лідэраў «Маладога фронту» Іван Шыла.

Тыя, хто выпісвае позвы, спадзяюцца, што з дапамогай арміі змогуць збіць актыўнасць маладзёнаў. На практыцы ж хлопцы атрымліваюць нялішнюю загартоўку. А прыклад Тараса Шаўчэнкі паказвае, што з войска часам вяртаюцца геніяльнымі паэтамі і сімваламі нацыі.

### Крык душы году: Віктар Гарбачоў

Усю гаму пачуццяў апазіцыйных кандыдатаў у палату прадстаўнікоў праілюстраваў барысавец Віктар Гарбачоў, які ў ноч парламенцкіх выбараў у інтэрв'ю «Нашай Ніве» шчыра выгукнуў: «Нас кінулі, бляха!» І столькі адчаю і падманутай наіўнасці чыталася ў ягоных словах... А што ж вы хацелі?

### Градус году: Сяргей Шмолік

Беларускі футбол сёлета праславіўся не толькі поспехамі БАТЭ, але і ўчынкам брэсцкага суддзі Сяргея Шмоліка, які выйшаў працаваць на матч чэмпіянату краіны п'яным. Спачатку балельшчыкі думалі, што ў рэферы проста скурчыла спіну, але потым зразумелі, што Шмолік лыка не вяжа. Кадры, калі арбітра выводзяць пад рукі з поля, абляцелі найбольшыя тэлеканалы планеты. Такога ў сусветнай футбольнай практыцы яшчэ не бачылі. Сам жа Шмолік быў дыскваліфікаваны пажыццёва.

Вось вам і адказ, чым сённяшняя Беларусь розніцца ад іншых краінаў свету.

### Пакутнікі году: Іван Ціхан і Вадзім Дзевятоўскі

Медалісты пекінскай Алімпіяды, малатабойцы Іван Ціхан і Вадзім Дзевятоўскі, былі пазбаўленыя ўзнагарод. Допінг-кантроль паказаў, што тэстастэрон у крыві атлетаў зашкальваў. Самі спартсмены растлумачылі гэта тым, што падчас спаборніцтваў адмовіліся ад сэксу і харчаваліся яйцамі буйной рагатай жывёлы. Вось пакутнікі: і ад сэксу адмовіліся, і ўсякае лайно елі, і медалёў не атрымалі.

### Спявак году: Сяргей Міхалок

Пакуль апальныя рок-музыкі звыкаюцца да свайго новага становішча і здымаюць кліпы на тэлеканале «Лад», «Ляпіс Трубяцкой» выдаў нонканфармісцкі альбом. З дзвюма песнямі па-беларуску. У адной з якіх спяваецца:

Сэрца палае, далонь не дрыжыць
Ды паляўнічы дамоў бяжыць.
Пагоня побач —
Будзем жыць!
BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELARUS FREEDOM!!!
BELORUSSIA LIBERTA


PHOTO.BYMEDIA.NET

Пасля выбуху 3 ліпеня ўсе дазналіся, што такое дактыласкапія.

### Абаронцы году: Аляксандр Галіеў, Мар'яна Сімешка, Павел Сапелка

Не так і многа адвакатаў адважваецца абараняць палітычных праціўнікаў Лукашэнкі. Таму працу Аляксандра Галіева, Мар'яны Сімешкі, Паўла Сапелкі нельга недаацэньваць. Часта на падобных працэсах адвакаты выступаць з больш смелымі заявамі адносна сітуацыі ў краіне, чым самі абвінавачаныя. Для гэтага трэба мець неабыякую грамадзянскую мужнасць.

### Закладнік году: Яўген Шыгалаў

За аферы з зямлёй быў арыштаваны адзін з найбагацейшых людзей краіны, дырэктар «Ждановічаў» Яўген Шыгалаў. Зрэшты, запомніўся не сам арышт, а рэкордны заклад, які заплацілі за хворага бізнесмена, каб ён меў магчымасць зрабіць аперацыю за мяжой. Каб Шыгалаў убачыў неба Лондана, было заплачана каля пяці мільёнаў доляраў. Цяпер з яго патрабуюць яшчэ 40 — нібыта за парушэнні экалогіі пры будаўніцтве гандлёвага комплексу. Зараз пакінуць і без Жданоў, і без штаноў.

### Багдановіч году: Святлана Зелянкоўская

Адной з значных культурных падзей году была пастаноўка мюзіклу «Дзень Максіма». Галоўную ролю Максіма Багдановіча ў пастаноўцы выканала... Святлана Зелянкоўская. Няхай «Дзень Максіма» і атрымаў не самыя аднязначныя водгукі, але ігра самой Зелянкоўскай была бліскучай.

### Прэзідэнт году: Барак Абама

Абама стаў першым афраамерыканцам, які заняў пасаду кіраўніка наймагутнейшай краіны свету. Так Амерыка канчаткова развіталася з расавымі забабонамі. Абама стаў новым увасабленнем амерыканскай мары. Народжаны ў беднай сям'і, ён выбіўся ў людзі, скончыў адзін з самых прэстыжных універсітэтаў. Сваю кар'еру ён пачаў не з заранення грошай, як большасць ягоных аднагодкаў, а з сацыяльнай работы ў Чыкага.

### Смяльчак году: іракскі журналіст

Ярка і артыстычны выказаў свае палітычныя погляды іракскі журналіст Мунтадар аль-Зайдзі — запусціў туфлямі ў Джорджа Буша. Паспрабаваў бы ён шпурнуць у Хусэйна...

**Зміцер Панкавец**



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Пацан году: Раман Мянцюк

У сакавіку ўся Беларусь была шакаваная паведамленнем пра здарэнне на трасе Мінск — Мікашэвічы. Каб спыніць п'янага кіроўцу, які з хуткасцю 180 км/г уцякаў ад міліцыянтаў, інспектары ДАІ перагарадзілі дарогу прыватнымі легкавымі аўтамабілямі, не высадзіўшы адтуль людзей. На шчасце, абышлося без чалавечых ахвяраў, хаця кіроўца Мянцюк і ўрэзаўся ў адзін з аўтамабіляў. Інфармацыя патрапіла ў прэсу. Следам пачалі ўсплываць і даўнейшыя падобныя выпадкі... У выніку Раману далі пяць гадоў калоніі, а міліцыянты-арганізатары ўсяго толькі абмежаваліся ўмоўнымі тэрмінамі і работу памянялі.

### Дзіця году: Міколка Лукашэнка

Яшчэ ў 2007 годзе пачулі, што Лукашэнка, калі і перадасць сваю ўладу, то толькі «самаму маленькаму, унікальны расце чалавек». Сёлета на агульнарэспубліканскім суботніку мы пабачылі гэтага самага маленькага. Потым Міколка Лукашэнка стаў з'яўляцца з бацькам і на іншых мерапрыемствах. Кіраўнік краіны браў сына на Алімпіяду ў Пекін, а таксама на саміт СНД у Бішкек. На пытанне пра маці Колі, Лукашэнка адказаў, што «гэта адна доктарка». Людзі ж звыкліся, што ў тэлевізары Лукашэнка з'яўляецца цяпер выключна з сынам.



### Яны адышлі ад нас за 2008 год

**Аляксандр Абдулаў** — расійскі актор;
**Сэр Эдмунд Хілары** — чалавек, які першым узышоў на Эверэст;
**Бобі Фішэр** — былы чэмпіён свету па шахматах;
**Генерал Сухарта** — былы прэзідэнт Інданезіі;
**Язэп Ганчар** — брат зніклага Віктара Ганчара;
**Кастусь Акула** — пісьменнік, дзеяч эміграцыі;
**Вера Розум** — маці Генадзя Карпенкі;
**Ален Роб-Грые** — французскі пісьменнік;
**Брэндан Х'юз** — легендарны камандзір ІРА;
**Ягор Летаў** — расійскі музыка;
**Ірына Казуліна** — жонка палітвязня;
**Артур Кларк** — пісьменнік-фантаст;
**Юрка Аляхновіч** — сын Францішка Аляхновіча;
**Вера Шостак** — віленская беларуска;
**Андрэй Вайтовіч** — ветэран беларускага вызвольнага руху;
**Надзея Румянцава** — расійская акторка;
**Міхаіл Таніч** — расійскі паэт;
**Альберт Масальскі** — пробашч мінскага Кальварыйскага касцёлу;
**Альберт Хофман** — навуковец, які вынайшаў таблеткі ЛСД;
**Ірэна Сэндлер** — жанчына, якая выратавала дзве з паловай тысячы габрэйскіх дзяцей;
**Анатоль Кірвель** — пісьменнік;
**Рыма Казакова** — расійская паэтка;
**Сідні Полак** — знаны рэжысёр;
**Валянцін Рабцэвіч** — гісторык;
**Іў Сэн-Ларан** — найвялікшы дызайнер вопраткі XX стагоддзя;
**Міхаіл Герчык** — пісьменнік;
**Чынгіз Айтматаў** — расійскі і кіргізскі пісьменнік;
**Мітрафан Рэпкаў-Смаршчок** — дзеяч беларускай эміграцыі;
**Нона Мардзюкова** — расійская акторка;
**Святаслаў Хадановіч** — музыка;
**Браніслаў Спрынчан** — пісьменнік;
**Лангіна Брылеўская** — дзеячка эміграцыі;
**Анатоль Прыстаўкін** — расійскі пісьменнік;
**Мікола Сенька** — дзеяч эміграцыі;
**Валер Місюк** — старшыня Таварыства беларускай культуры Літвы;
**Пётра Рашэтнік** — ветэран нацыянальнага руху;
**Міхаіл Пугаўкін** — расійскі актор;
**Аляксандр Салжаніцын** — расійскі пісьменнік;
**Іван Сабалеўскі** — цесць Аляксандра Казуліна;
**Міхаіл Мукасей** — найстарэйшы савецкі разведчык;
**Васіль Несцярэнка** — дырэктар Інстытуту радыяцыйнай бяспекі;
**Магамед Еўлоеў** — лідэр апазіцыі Інгушэціі;
**Міхаіл Лаўрыновіч** — беларускі прамысловец;
**Ксеня Красоўская** — маці Анатоля Красоўскага;
**Рычард Райт** — сузаснавальнік Pink Floyd;
**Сяргей Андрушчанка** — сябар АГП, баранавіцкі прадпрымальнік;
**Іна Карпюк** — удава Аляксея Карпюка;
**Валеры Лабко** — фатограф;
**Аляксей Чарапанаў** — хакеіст;
**Пётра Явіч** — мастак;
**Урмас От** — эстонскі журналіст;
**Сястра Эманюэль** — манашка, якая ўсё сваё жыццё прысвяціла дапамозе абяздоленым;
**Максім Сямёнаў** — гендырэктар «MTV у Беларусі»;
**Муслім Магамаеў** — расійскі спявак;
**Тоні Хілерман** — амерыканскі пісьменнік;
**Генадзь Кісялёў** — літаратуразнаўца;
**Аляксандр Дракахруст** — пісьменнік;
**Алег Лойка** — літаратуразнаўца і педагог;
**Ян Махульскі** — польскі актор;
**Аляксій II** — патрыярх Маскоўскі;
**Юры Фрыдман** — рэжысёр-мультыплікатар;
**Вольга Кандрацьева** — гандбалістка зборнай Беларусі;
**Ніна Мацяш** — паэтка;
**Эберхард Хайкен** — былы кіраўнік місіі АБСЕ ў Беларусі;
**Гаральд Пінтэр** — англійскі драматург.

**Падрыхтаваў ЗП**

# АЭС на Нарачы збудуюць расіяне

«Росатом» стане генеральным падрадчыкам.

Пра гэта паведаміў дырэктар дэпартаменту па развіцці ядзернай энергетыкі Міністэрства энергетыкі Мікалай Груша. Перамовы з расійскім бокам пройдуць у пачатку 2009 году.

З ягоных словаў, беларуская адміністрацыя не мела іншага выхаду, бо атрымала прапанову толькі ад расійскай кампаніі. У сваю чаргу, пасол Францыі звярнула ўвагу, што тэндэрная прапанова была сфармулявана такім чынам, што яе выканаць мог толькі «Росатом», бо толькі расійская кампанія будуе рэактары запрошанага тыпу. Французская «Арэва» і амерыканска-японская карпарацыя вырабляюць рэактары наступнага пакалення.

Нагадаем, што ў мінулую пятніцу было канчаткова прынята рашэнне, што атамная электрастанцыя ў Беларусі будзе збудавана між мястэчкамі Міхалішкі і Варняны ў Астравецкім раёне (Гродзенская вобласць). Гэта ўсяго за 30—40 км ад Вільні — сталіцы Вялікага Княства Літоўскага і пярліны ў нацыянальнай спадчыне народаў ВКЛ. А таксама за 30—40 км ад найбольшага возера краіны, Нарачы. Гэтая адлегласць выглядае злавесна, калі ўлічыць, што 30-кіламетровая зона вакол Чарнобыльскай АЭС стала непрыдатнай для пражывання чалавека на стагоддзі.

Астравецкай пляцоўцы аддалі перавагу перад альтэрнатыўнымі варыянтамі Быхава і Чавусаў.

Прадказальны выбар расійскага падрадчыка быў абвешчаны адразу пасля перамоваў Аляксандра Лукашэнкі ў Маскве, вынікам якіх стала абяцанне чарговы год пастаўляць у Беларусь газ «па прымальных цэнах».

Рэжым Аляксандра Лукашэнкі атрымлівае шматмільярдныя датацыі ад Масквы ўзамен за доўгатэрміновую прывязку беларускай гаспадаркі да Расіі. Беларусь трапіла ў поўную залежнасць ад паставак энерганосьбітаў з Расіі і праводзіць выгадную Маскве замежную і культурную палітыку.

Многія беларускія навукоўцы і экологі крытыкавалі як само рашэнне аб пабудове АЭС у Беларусі, так і выбар расійскіх тэхналогій. Адзінай мегакатастрофай у гісторыі атамнай энергетыкі стаў выбух на Чарнобыльскай АЭС, збудаванай акурат саветамі.

Пабудова АЭС расіянамі азначае, што Беларусь вымушана будзе дзесяцігоддзямі залежаць ад паставак атамнага паліва з Расіі і абслугоўвання станцыі расійскімі інжынерамі.

**Мікола Бугай**

**Пляцоўка знаходзіцца**

ў паўночнай частцы Астравецкага раёна, паміж вёскамі Гоза і Міхалішкі каля аўтадарогі Вільня — Полацк (Р–45).

**Намеснік кіраўніка адміністрацыі Астравецкага раёна па ідэалогіі**

Віктар Свіло лічыць: **«Меркаванне пра перспектыву будаўніцтва атамнай электрастанцыі набыло больш станоўчае адценне. Людзі ў большай ступені пазбаўляюцца ад «чарнобыльскага сіндрому», які быў характэрны ў пачатку 2008 году».**

**Паводле БелаПАН**

## Масква словам не верыць

Умова выдачы другой траншы — падпісанне Беларуссю мемарандуму аб допуску ў краіну расійскага капіталу.

Крэмль абверг заяву Лукашэнкі пра тое, што выдача Беларусі другой траншы расійскага крэдыту ($1 млрд) — справа вырашаная. Пра гэта паведаміла агенцтва «РІА «Новости» са спасылкай на крыніцу ў адміністрацыі прэзідэнта Расіі. «Дадзена даручэнне кіраўнікам цэнтрабанкаў абедзвюх краінаў распрацаваць гэтае пытанне, але канчатковае рашэнне яшчэ не прынятае», — адзначыў прадстаўнік Крамлю.

Першы транш крэдыту Беларусь атрымала 18 лістапада.

Маскоўскі палітолаг Андрэй Суздальцаў падкрэслівае: кіраўнік Беларусі не дагаворвае істотных рэчаў: «Лукашэнка быццам не чуе пра тое, што ўмова выдачы другой траншы — падпісанне мемарандуму, які не падпісалі пры выдачы першай траншы. Мемарандум падрыхтавалі яшчэ да першай траншы. І ён уключае ў сябе шэраг грунтоўных момантаў. У прыватнасці, роўныя правы расійскага бізнесу на беларускім рынку, удзел расійскага бізнесу на роўных правах у прыватызацыі аб'ектаў і вытворчых актываў і г.д.».

**Паводле радыё «Свабода»**

**СЦІСЛА**

### Казулін выйшаў з БСДП

На апошнім паседжанні ЦК БСДП ганаровы старшыня партыі Аляксандр Казулін заявіў, што выходзіць з шэрагаў арганізацыі. Аб сваім выхадзе з партыі заявілі таксама Вольга Казуліна, Аляксей Кароль і Уладзімір Ніспюк. А што Казулін мае рабіць? Гавораць, неўзабаве пачне паездкі па краіне. Пайшлі чуткі, што ён стане прарэктарам Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту, што працуе на выгнанні ў Вільні. Аднак сам Казулін тыя чуткі абверг.

### Агулам 90 тысяч чалавек

узялі ўдзел у святочных набажэнствах, што прайшлі ўначы на 25 снежня ў каталіцкіх храмах Беларусі. Пра гэта паведамілі ў МУС. У Мінску на начныя набажэнствы сабралася каля 3 тысяч 300 чалавек.

**ЗП**

**IN MEMORIAM**

### Ніна Мацяш

19 снежня не стала паэткі Ніны Мацяш. Яна была чалавекам магутнай волі і працаздольнасці. Яна пераадольвала хваробу і была ўзорам вернасці ідэалам, Бацькаўшчыне.

Пры яе вялікай асабістай мужнасці яна заставалася асобай далікатнай, адчувальнай, пяшчотнай і праніклівай. Ніна Мацяш успрымала прыгажосць свету шырока расплюшчанымі дзіцячымі вачыма. І з лёгкасцю знаходзіла супольную мову з дзецьмі.

Бывае, ідзеш па Белаазёрску і бачыш — пад шатамі дрэваў стаіць яе вазок. Спадарыня Ніна працуе, нешта слухае або проста размаўляе са знаёмымі. Адчуваеш — усё добра, усё як мае быць. Гэта як сонца. Яно заходзіць і ўзыходзіць. І ёсць жыццё, пакуль ёсць гэты сонцазварот.

Яе апошнім вялікім перакладам быў «Маленькі прынц». Гэты прынц — яна сама. Гэта пра яе. Гэты пераклад Ніна Мацяш пакінула нам замест аўтабіяграфіі.

**Юры Губарэвіч, намеснік старшыні Руху за Свабоду, зямляк**

## Ходзім па зачараваным коле

Рэдакцыя папулярнага на Гродзеншчыне незалежнага выдання «Газета Слонімская» дагэтуль не атрымала адказу пра магчымасць вяртання ў дзяржаўную сістэму распаўсюду. «Я двойчы дасылаў паперы ў абласныя арганізацыі «Белпошты» і «Белсаюздруку», у Мінск — першы раз у верасні, другі — пасля таго, як у распаўсюд вярнулі «Народную волю» і «Нашу Ніву». Але адказ прыйшоў толькі з рэспубліканскага аддзялення «Белпошты» — там нам адмовілі. Астатнія пакуль не адгукнуліся пісьмова» — распавёў галоўны рэдактар «ГС» Віктар Валадашчук. Па яго словах, ён таксама тэлефанаваў у тыя арганізацыі.

«Паўсюль кажуць, што нічога супраць не маюць, каб супрацоўнічаць, прыгадваюць, што мелі ад нас неблагі прыбытак. Так, у слонімскіх шапіках прадавалася больш за тысячу асобнікаў газеты. Але і «Белпошта», і «Белсоюздрук» кажуць, што пытанне нашага вяртання залежыць не ад іх.

Сп. Валадашчук тэлефанаваў у абласное ўпраўленне ідэалогіі: «Там таксама не супраць, але кажуць, што такія пытанні рэдакцыя мусіць высвятляць наўпрост з арганізацыямі распаўсюду — «Белпоштай» і «Белсоюздрукам». Карацей, ходзім па зачараваным коле».

З пачатку 2006 г. газета даходзіць да чытачоў дзякуючы незалежным распаўсюднікам, а таксама праз рэдакцыйную падпіску. Супрацоўнікі рэдакцыі выязджаюць у рэгіёны і ладзяць падпіску на месцах. «Газету Слонімскую» чытаюць не толькі ў Слонімскім, але і ў Дзятлаўскім, Зэльвенскім, Мастоўскім, Ваўкавыскім раёнах Гродзеншчыны.

«Газета Слонімская» — найстарэйшае незалежнае перыядычнае выданне ў Слоніме, заснаванае 25 снежня 1938 г. беларускім паэтам Сяргеем Новікам-Пеюном і ягонай жонкай Людмілай. Газета выходзіла па-польску, бо дазвол рабіць беларускае выданне Новікі не атрымалі ад уладаў. На пачатку 1939 г. выдавец «ГС» быў арыштаваны, а выданне спыніла існаванне.

«Газета Слонімская» была аднаўленая 24 красавіка 1997 г. як грамадска-палітычнае незалежнае выданне.

**Сямён Печанко**

**ЗДЫМКІ ГОДУ**

**Смачныя персікі! Расійскія салдаты у Грузіі. Расійска-грузінскі канфлікт за Асецію змяніў геапалітычную сітуацыю.**



PHOTOBYMEDIANET

# Беларусь цесна супрацоўнічала з ЦРУ яшчэ ў 2002 годзе

**Аўтары шумнай кнігі Ghost Plane («Самалёт–прывід») — пра таемныя выкраданні і перавозку падазраваных у тэрарызме людзей па ўсім свеце амерыканскімі спецслужбамі — высветлілі, што самалёты ЦРУ вывозілі падазраваных у Гуантанама таксама і праз аэрапорт Мінск–2.**

Яны ўстанавілі два канкрэтныя рэйсы з выкрадзенымі людзьмі праз аэрапорт Мінск-2, што мелі месца 13 сакавіка і 25 чэрвеня 2002 году, намякаючы на магчымасць іншых падобных рэйсаў, якія не ўдалося ідэнтыфікаваць.

Пасля падзеяў 11 верасня 2001 году амерыканскія спецслужбы ў рамках «вайны з тэрарызмам» распачалі буйнамаштабную кампанію фактычнага выкрадання ў розных краінах асобаў, якія лічыліся падазраванымі ў тэрарызме, з іх далейшым таемным перавозам у амерыканскія ці замежныя турмы. Такая практыка затрыманняў мела сумнеўныя юрыдычныя падставы і парушала правы чалавека, што стала прычынай для некалькіх шумных разьбіральніцтваў. Італія наагул наважылася затрымаць і судзіць агентаў ЦРУ за выкраданне, здзейсненае на яе тэрыторыі ў 2003 годзе.

Шырокі розгалас набыла гісторыя нямецкага грамадзяніна ліванскага паходжання Масры. Ён быў арыштаваны ў Македоніі мясцовымі паліцыянтамі і затрыманы на 23 дні без ніякіх тлумачэнняў ды сувязі са светам, фактычна зьнікнуўшы без вестак для ўсіх. Пасля яго вывезлі ў сакрэтную турму ЦРУ ў Аўганістане. Праз 5 месяцаў адзіночнага зняволення амерыканцы зразумелі, што Масры трапіў у іх сетку выпадкова, вывезлі яго ў глухую албанскую вёску і выпусцілі.

Гэта — адзін з больш чым ста выпадкаў выкрадання людзей, што сталі вядомымі. У выпадках гэтых «затрыманняў» пэўных людзей хапалі на вуліцы адной краіны і вывозілі ў іх родную або проста іншую краіну, якая іх вышуквала, або на тэрыторыі якой маглі быць праведзеныя нелегальныя следчыя дзеянні.

У свой час следства Рады Еўропы паказала, што прынамсі 14 еўрапейскіх краінаў супрацоўнічалі з ЦРУ ў сакрэтнай перавозцы выкрадзеных людзей прыватнымі лятакамі праз сваю тэрыторыю. Больш за тое, у студзені 2006 году ў СМІ з'явіліся паведамленні, што супрацоўнікі амерыканскіх спецслужбаў дапытвалі падазраваных у тэрарызме ў сакрэтных усходнееўрапейскіх турмах,



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Не толькі Уга Чавэса прымаў «Мінск-2».**

дзе ствараліся нялюдскія ўмовы ўтрымання. Заходнія ўрады, у прыватнасці Іспанія, упарта адмаўлялі сваю інфармаванасць пра незаконныя дзеянні ЦРУ па транспартаванні выкрадзеных самалётамі праз сваю тэрыторыю. Усходнееўрапейцы аддавалі перавагу маўчанню.

Па выніках расследавання Еўрапарламенту ў 2006 годзе высветлілася, што ЦРУ ажыццявіла больш за тысячу недэклараваных палётаў над еўрапейскай тэрыторыяй пачынаючы з 11 верасня 2001 году — многія самалёты ішлі з выкрадзенымі на борце. Як зазначыў дэпутат Еўрапарламенту Джавані Клаўдыё Фава, які браў удзел у гэтым расследаванні, «пасля 11 верасня ў рамках барацьбы з тэрарызмам парушэнні правоў чалавека і асноўных правоў не былі ізаляваным ці экстраардынарным захадам, абмежаваным кароткім часовым прамежкам, але хутчэй нагадвалі шырока распаўсюджаную рэгулярную практыку, да якой мелі дачыненне большасць еўрапейскіх краінаў».

Як паказала расследаванне Еўрапарламенту, самалёты ЦРУ рабілі шматлікія пасадкі на тэрыторыі еўрапейскіх краінаў, якія ніколі не дэкляраваліся, што было парушэннем міжнароднай дамовы, якая вымагае ад авіякампаній дэкляраваць маршрут і месцы прамежкавай пасадкі самалётаў з паліцэйскай місіяй. Прадстаўнікі ЦРУ каментавалі інфармацыю пра сакрэтныя палёты, кажучы, што многія з іх былі звязаныя з перавозкай персаналу, матэрыялаў ці кіраўніцтва агенцтва па дарозе ў іншыя краіны, а не з транспартаваннем падазраваных.

Якім чынам у гэтай амерыканскай схеме магла апынуцца Беларусь з крытычным стаўленнем яе кіраўніцтва да амерыканскага ўраду ў 2002 годзе? Наіўна дапускаць, што Мінск не ведаў пра тыя палёты, бо занадта шырокамаштабнай была адпаведная дзейнасць амерыканскіх спецслужбаў у свеце, каб застававацца таямніцай. Не толькі заходнееўрапейскія краіны тады заплюшчвалі вочы на штукарствы ЦРУ, зважаючы на тое, якую ўвагу амерыканцы надавалі вайне з тэрарызмам. З Вашынгтонам пачалі тады ціха супрацоўнічаць і іншыя апірышчы антыамерыканізму, як то Іран.

Імаверна, што і Беларусь, як гэта не раз бывала і раней, маўкліва дапамагала ЗША. Разлічваючы на палітычныя і фінансавыя дывідэнды.

**Сяргей Богдан**

# Пазняк пераабраны старшынём КХП-БНФ




PBPF.ORG

**21 снежня ў мінскім палацы трактарнага заводу адбыўся VIII З'езд Кансерватыўна–Хрысціянскай Партыі — БНФ.**

З'езд быў выбарны. На пасаду старшыні быў прапанаваны на безальтэрнатыўнай аснове Зянон Пазняк. Яго падтрымалі аднагалосна. Не адбылося зменаў і сярод намеснікаў старшыні — пасады захавалі Юрась Беленькі і Сяргей Папкоў. Таксама быў абраны Сойм КХП-БНФ у складзе 35 чалавек.

Юрась Беленькі кажа: «Звычайны рабочы з'езд, якія адбываюцца ў нас раз на два гады. Былі праблемы з памяшканнем, але давялося прыняць прапанову палацу трактарнага заводу, хоць і было дарагавата. У працы з'езду браў удзел 101 дэлегат, а таксама 89 гасцей. Быў агучаны даклад Зянона Пазняка, выступалі дэлегаты з'езду. Была вельмі цікавая гутарка. Прыемна, што нават не ў самых спрыяльных умовах сябры нашай партыі захоўваць аптымізм і працягваюць сваю дзейнасць».

**Зміцер Панкавец**

# Бунт полацкага бізнэсоўца

Уладзімір Захараў два дні трымаў зачыненымі гандлёвыя дамы ў Полацку і Наваполацку.

У Полацку і Наваполацку два дні запар не працавалі буйныя гандлёвыя дамы «Стралецкі рынак», «Еўралюкс» і «Стралецкі капітал». Зрабіць так загадаў уладальнік рынкаў Уладзімір Захараў. Ён заявіў, што «не бачыць сэнсу працы ў такіх жорсткіх умовах, якія яшчэ горш узмацняюцца ў Беларусі». Пазней звязацца з ім не ўдавалася. На тэлефанаванні не адгукаліся ягоныя памочнікі. У гарвыканкамах Полацку і Наваполацку, куды паабяцалі прыйсці прадпрымальнікі, паведамілі, што не могуць наўпрост паўплываць на Захарава. «Мы параілі прадпрымальнікам, якія арандавалі гандлёвыя плошчы ў ГД «Стралецкі капітал», рыхтаваць калектыўны пазоў у Гаспадарчы суд на дзеянні ўласніка гандлёвага дому Уладзіміра Захарава», — паведаміла начальніца аддзелу гандлю Ірына Мінчукова. Тое самае адказалі і ў полацкім гарвыканкаме. «Гарвыканкам не прымаў ніякіх мераў па закрыцці рынку, наадварот, мы робім усё магчымае, каб яго адчыніць», — паведаміла начальніца аддзелу Ірына Гукава.

У аўторак увечары гандлёвыя цэнтры адчыніліся таксама нечакана, як і замкнуліся.

Тым часам сярод наваполацкіх гандляроў ходзяць розныя версіі гэтай падзеі. Частка гандляроў мяркуе, што Захараў такім чынам адрэагаваў на хуткія змены ў працы індывідуальных прадпрымальнікаў — 1 студзеня 2009 году тыя з іх, хто не паспеў афарміць пераход у ПУП, вымушаныя будуць спыніць працу. А гэта можа прывесці да рэзкага скарачэння арандатараў гандлёвых плошчаў. Кажуць таксама, што апошнім часам дзейнасць полацкага бізнэсоўца часта правяралі.

**Сямён Печанко**

# Падарунак на Новы год

Лукашэнка збаяўся прыціснуць прадпрымальнікаў.

Указам №703 ад 24 снежня А. Лукашэнка зняў абмежаванне па перыядзе дзеяння вызвалення ад мытнага афармлення і абкладання мытнай пошлінай (зборамі) пры ўвозе ў Беларусь тавараў з Расіі ў дачыненні да індывідуальных прадпрымальнікаў — платнікаў адзінага падатку, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль. Вызваленне ад мыта мусіла дзейнічаць да 1 студзеня 2009 году.

**СП**

## СЦІСЛА

### «Герой працы» спыніўся

Калектыў Добрушскай папяровай фабрыкі, акрамя дзяжурных службаў, сыходзіць у вымушаны адпачынак да 12 студзеня з захаваннем дзвюх трацінаў заробку — з розніку сярэднямесячнай стаўкі памерам 220 тысяч рублёў. На прадпрыемстве вымушаныя адпачынкі тлумачаць адсутнасцю замоваў.

### Газ для Беларусі будзе каштаваць $160—170

Пра гэта паведаміла інфармаваная расійская крыніца. У прэс-службе ААТ «Газпром» гэтую інфармацыю не каментуюць. Прадстаўнік «Газпрому» толькі нагадаў, што «ёсць дамоўленасці ў дачыненні да таго, што кантракт дзейнічае, формула дзейнічае, але будуць нейкія карэкціроўкі. Мы разумеем, што важна не толькі ўстанавіць цану, але важна яшчэ і грошы атрымаць. Таму і ідзем на пэўныя кампрамісы».

Для расійскіх спажыўцоў цана газу будзе на ўзроўні 1900 рублёў (каля 65 даляраў), оптавая для еўрапейскіх спажыўцоў — 260—300 даляраў, паведаміў С.Купрыянаў. На працягу году, паводле яго словаў, кошт газу будзе зніжацца для ўсіх еўрапейскіх спажыўцоў.

**СП; паводле БелаПАН, радыё «Свабода»**




У 2009 годзе беларускае машынабудаванне чакаюць цяжкія выпрабаванні.

# «Ноў крэдытс» у замежнай валюце

Галоўная фінансавая ўстанова краіны «настойліва рэкамендавала» камерцыйным банкам спыніць выдачу валютных крэдытаў насельніцтву, паведаміў прадстаўнік аднаго з камерцыйных банкаў. Такія захады тлумачацца складанай сітуацыяй на валютным рынку. У прэс-службе Нацбанку каментаваць гэтую інфармацыю адмовіліся.

**СП**

# Паскарэнне на тле запавольвання, альбо Лоўкасць рук нацыянальнай статыстыкі

Піша эканаміст **Аляксандр Чубрык**.

На мінулым тыдні Нацыянальны статкамітэт — Белстат — абвесціў вынікі працы эканомікі за 11 месяцаў. Не ведаю, як хто, але я здзівіўся — у параўнанні з студзенем—кастрычнікам рост ВУП паскорыўся і склаў 10,8% (у параўнанні з 11 месяцамі мінулага году)! Ды ў той час, калі ўрадоўцы гавораць пра крызіс, рост запасаў ды запавольванне росту. Натуральна, палез на сайт (для цікаўных — http://belstat.gov.by/) ды пачаў разбірацца.

Як выявілася, у студзені—лістападзе прамысловая вытворчасць вырасла на 12,7% (у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага году). Выглядае някепска. Але ж за лістапад тэмп прыросту склаў усяго 4,1% (да лістапада 2007-га). Гэта ўжо бліжэй да сусветных тэндэнцыяў, асабліва калі ўлічыць, што ў кастрычніку было 10,3%, а ў верасні — 13%.

Але і гэта яшчэ не ўсё. Бо, як слушна казалі розныя афіцыйныя асобы, апошнія два месяцы раслі запасы прамысловай прадукцыі. Калі адняць ад аб'ёмаў прамысловай вытворчасці за кастрычнік і лістапад кошт «назапашанай» гатовай прадукцыі, то выйдзе, што ў кастрычніку прамысловая вытворчасць вырасла на 5,9%, а ў ластападзе — скарацілася на 3,2% у параўнанні з адпаведнымі перыядамі мінулага году.

Звяртае ўвагу такі феномен: рост у асноўных галінах прамысловасці (іх дзевяць — электраэнергетыка, паліўная прамысловасць, чорная металургія, хімія і нафтахімія, машынабудаванне, дрэваапрацоўка, будматэрыялы, лёгкая і харчовая прамысловасць, і ў іх выпрабляецца 85—90% усёй прамысловай прадукцыі) час ад часу шмат павольнейшы, чым рост у прамысловасці ўвогуле.

«Іншыя галіны» з'яўляюцца своеасабліваю «чорнаю скрыняй», якая жыве ўласным жыццём. Гэта такія невялікія галіны, як каляровая металургія, шкляная і парцалянава-фаянсавая, мукамольная, мікрабіялагічная, медычная і паліграфічная прамысловасць.

Калі ў асноўных галінах усё добра, то «іншыя» растуць павольна, калі кепска — рост у іх раптам паскараецца. Ці проста вытворчасць у іх расце ў некалькі разоў хутчэй. Не зрабіўся выключэннем і лістапад гэтага году — вытворчасць у дзевяці асноўных галінах (без уліку складоў) вырасла ўсяго на 2,2%, а ў іншых галінах — на 16,1% (у параўнанні з леташнім лістападам). Калі скарэктаваць тэмпы росту ў гэтых галінах, то выйдзе, што прамысловасць (а значыць, і эканоміка ўвогуле) расце шмат павольней, чым гэта падаецца афіцыйнай статыстыкай.

Што да паскарэння росту ВУП, то афіцыйная статыстыка тлумачыць яго найперш бумам у сельскай гаспадарцы. У кастрычніку — рост на 18,3%, а ў лістападзе — на 23,1% проці адпаведных месяцаў 2007-га. Вось якая галіна эканоміку выцягнула! Толькі ў мінулыя гады часта бывала, што рост у сельскай гаспадарцы ў 4-м квартале змяняўся запавольваннем у 1-м квартале наступнага году.

Памятаеце, нядаўна заробкі бюджэтнікам нібыта падвысілі, а потым перагледзелі? То і з статыстыкай гэтаксама. Нацыянальныя адметнасці...

# Макей: Гістарычны выбар на карысць суверэнітэту

**Упершыню за доўгі час чыноўнік высокага рангу — кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей — зрабіў выступ па-беларуску.**

«Нягледзячы на палітычную кан'юнктуру, можна сцвярджаць, што, атрымаўшы нялёгкую гістарычную спадчыну, мы паспяхова будуем беларускую дзяржаву». Аб гэтым кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей **(на фота)** заявіў на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці». Упершыню за доўгі час чыноўнік такога рангу выступіў па-беларуску.

Ён адзначыў, што распад СССР паставіў перад беларускім народам некалькі гістарычных альтэрнатываў. Рэалізацыя некаторых з іх прывяла б да страты суверэнітэту і знікнення Беларусі з палітычнай карты свету. Установачны выступ не абышоўся, ясная рэч, без панегірыкаў: «Смутнае для краіны ліхалецце завяршылася ў 1994 годзе з выбраннем першага прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі чалавека, які пакончыў з ліхалеццем.

Аднак найважнейшым было іншае — спробы інтэграваць розныя крыніцы нацыянальнае традыцыі: «Беларуская дзяржаўнасць не была прынесена звонку. Полацкае і Тураўскае княствы, Кіеўская Русь і Вялікае Княства Літоўскае — усё гэта вехі нашай гісторыі, этапы станаўлення беларускага этнасу», — сказаў ён.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што Беларусь яшчэ да вайны стала паўнацэннай еўрапейскай дзяржавай. «З шасці невялікіх паветаў Мінскай губерні ў 1921 годзе БССР да 1939 году ператварылася ў даволі моцную еўрапейскую дзяржаву з насельніцтвам больш як 10 млн чалавек», — сказаў Макей. А ў чым была тая дзяржаўнасць? «Беларусы працавалі ў тысячах эфектыўных сельгаспрадпрыемстваў, на высокатэхналагічных заводах, з'явілася Акадэмія навук, універсітэт, ствараліся творы мастацтва». Між тым тысячы калгасаў працавалі і ў Татарстане, і творы мастацтва ствараў Муса Джаліль, але гэта не рабіла Татарстан еўрапейскай дзяржавай.

У салянцы пад назвай «беларуская дзяржаўная ідэалогія» адны элементы ўсё яшчэ выразна супярэчаць іншым. Напрыклад, калі «Беларусь яшчэ да вайны стала паўнацэннай еўрапейскай дзяржавай», то навошта мы сёння гэтую самую дзяржаву «будуем», лагічна пацікавіўся адзін з інтэрнаўтаў у сваім каментары на сайце NN.BY.

**Мікола Бугай, цытаты паводле БЕЛТА**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Лукашэнка паабяцаў нездагадлівых напружваць

**Адной фразай можна перакрэсліць усе спевы пра лібералізацыю эканомікі. Такая фраза прагучала з вуснаў афіцыйнага кіраўніка ў Бярозе. Піша Аляксандр Класкоўскі.**

23 снежня ўвечары там адчынялі чарговы лядовы палац. Як высветлілася, да яго пабудовы мае непасрэднае дачыненне тамтэйшы нараджэнец Юры Чыж — той самы, кіраўнік «Трайплу».

Паставіўшы яго ў прыклад, галоўны начальнік заклікаў іншых бізнесоўцаў «не хаваць грошы ў скарбонцы», а ўкласці «ў зямлю, што вас нарадзіла ды паставіла на ногі». І вось тут прагучала красамоўная рэмарка:

«Калі хто не разумее маёй просьбы, то, скажу шчыра, тых будзем напружваць».

Для айчыннага бізнесу ўсё гэта, канечне, звыклая рэч. Яго калоцяць як ігрушу ўвесь час. А вось што скажуць на гэта некаторыя лорды, якія надта ж нахвальвалі беларускую эканамічную лібералізацыю на інвестыцыйным форуме ў Лондане?

На самай справе нораў нашых уладаў — «нагінаць» прыватніка — ніколькі не змяніўся. А іх новая эканамічная палітыка нагадвае бальшавіцкі нэп. Калі мабілізацыйная эканоміка бяссільная, варта даць буржуям нагуляць тлушчыку. А там — гм-гм — пабачым...

Дарэчы, яшчэ адна свежая навіна: па выніках нарады ў прэзідэнта (яна прайшла таксама 23 снежня) дробныя гандляры расійскім шырспажывам атрымалі паслабленне.

Ім, праўда, павысілі ад 1,5 да 2 каэфіцыент на імпарт, але ж пакінулі запаветную льготу, тэрмін якой сыходзіў 1 студзеня. Інакш кажучы, тавар з Расіі па-ранейшаму можна будзе ўвозіць без пацвярджальных папер і сплачваць фіксаваны ПДВ.

Такім чынам, наверсе выявілі каласальны гуманізм: хай яшчэ тыя ІП пажывуць! А каб надта не лунালі ў аблоках, іх трошкі «напружылі» каэфіцыентам.

Зразумела, тут не столькі міласэрнасць працяла, колькі засцярога спрацавала. Толькі яшчэ не ставала на фоне крызісу атрымаць вулічныя бунты дробнай буржуазіі ды новую армію беспрацоўных!

Папраўдзе кажучы, аўтар гэтых радкоў не лічыць чаўнакоў, што снуюць з цюкамі кітайскага шырспажыву, увасабленнем перадавых тэндэнцый бізнесу. Але ў дадзеным выпадку важны не толькі эканамічны складнік.

Мы бачым маленькую перамогу згуртаванай грамады над чынавенствам. І гэта каштоўны грамадзянскі досвед. Асобныя пласты насельніцтва пакрысе вучацца ладзіць супраціў вертыкальнаму самаўладству з яго прынцыпам «Не аддасі сам — напружым!».

# Лоўкі Бэл, і нічога больш

**«Кіраўнік дзяржавы выдаў указ, які ўводзіць мараторый на праверкі суб'ектаў гаспадарання». Каментуе Барыс Тумар.**

Вы думаеце, падатковая інспекцыя будзе ліквідаваная ў нашай краіне? Ці будзе ліквідаваны Дэпартамент фінансавых расследаванняў? Ці аўдытарская палата — у форме Камітэту дзяржкантролю ці іншай? Не смяшыце людзей. Гэтыя інстытуты дзейнічаюць у кожнай краіне. Так, яны могуць і павінны дзейнічаць інакш, чым у Беларусі — не выкарыстоўвацца для зводзення палітычных і кланавых рахункаў, паважаць права на рызыку, грунтавацца на прыязным заканадаўстве. Але яны былі і будуць у любой рынкавай эканоміцы, якой будзе Беларусь.

У абвяшчэнні мараторыю на праверкі адчуваецца рука піяр-майстроў. Памятаеце, новаўзлены прэзідэнт Ючшанка скасоўваў ДАІ?

Сапраўднай пераменай было б, напрыклад, перайменаванне КДБ, адсячэнне ад яго савецкіх каранёў і выхаванне ў спецслужбах іншай карпаратыўнай культуры. Сапраўднай пераменай было б спыненне сталіністычнай, варварскай рубінаўскай рэформы адукацыі, якая зробіць нашу краіну інтэлектуальна неканкурэнтаздольнай. Сапраўднай пераменай было б... Але ўсё тое зробіць ужо наступны кіраўнік незалежнай Беларусі.

**P.S.** Роўна праз тры дні пасля гэтага ўказу падатковая прыйшла ў Фонд выдання «Нашай Нівы» з комплекснай праверкай.

# Рудкоўскі пра выдаленне польскіх ксяндзоў з Гродзеншчыны

Радавацца тут няма чаму.

Рэжым ратуе беларускасць ад польскіх ксяндзоў? Не смяшыце. Чхаць ён хацеў на гэту беларускасць.

Рэжым — па-першае — дэманструе перад Касцёлам сваю сілу. Трэба папросту час ад часу паказаць, «хто ў хаце гаспадар». Па-другое (я пераканаы, што гэта галоўны матыў гэтай эпапеі) — улады (канкрэтней, КДБ) імкнуцца справакаваць раскол унутры Касцёлу. Вось чаму ўсё гэта падаецца ў патрыятычнай упакоўцы (маўляў, мовы не ведаюць, ментальнасці не разумеюць).

Ну, а тое, што ў Касцёле, дакладней, у Гродзенскай дыяцэзіі, ёсць выпадкі дыскрымінацыі і прыніжэння беларускасці, то гэта так. Толькі тут галоўную ролю іграюць не прыезджыя палякі, а «палякі» мясцовага вырабу. Але гэтая праблема павінна быць вырашана ўнутры Касцёлу, а ўжо напэўна не з удзелам псеўдабеларускай улады з савецкай генеалогіяй.

**Паводле інтэрнэт-блогу Пётры Рудкоўскага ОП**

# Круглыя даты і культурныя страты

Сёлета самымі значнымі былі падзеі, звязаныя з юбілеямі Дуніна-Марцінкевіча і 90-годдзем БНР. Піша **Сяргей Харэўскі**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

З лютага мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч адкрыў і асвяціў мемарыяльную табліцу ў памяць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў касцёле ў Бабруйску. Прыехаўшы былі нават нашчадкі роду Дунінаў-Марцінкевічаў з Польшчы. Былі ў Валожынскім раёне, у вёсцы Тупальшчына, у Люцінцы, у Пяршаях. Быў тэатральны фэст у Бабруйску, была таленавітая пінігінская пастаноўка «Пінскай шляхты» ў Купалаўскім і, пры канцы году, у Палацы мастацтваў прадстаўнічая мастацкая выстава. Але на пачатку году ў Мінску быў знішчаны будынак XVIII ст., па вуліцы Рэвалюцыйнай, 14, дзе два гады жыў класік нашае літаратуры, стваральнік першай нацыянальнай беларускай оперы. Не паставілі ні ў Мінску, ні ў Валожыне ні помніка геніяльнаму класіку, ні нават бюсту. Дый самі святкаванні прайшлі, відавочна, не на дзяржаўным узроўні. На жаль.

### Круглая дата за круглым сталом

Не выпадала чакаць ад уладаў і спрыяння ў святкаванні 90 гадоў БНР. Тым больш прыемным сюрпрызам стаў круглы стол у рэдакцыі «Советской Белоруссии».

У ім узяў удзел шэраг гісторыкаў і галоўны рэдактар газеты Адміністрацыі прэзідэнта Павел Якубовіч. У прыватнасці, ён сказаў тады: «БНР ёсць часткай гісторыі беларусаў. (...) Сам факт, што ўпершыню ў гісторыі, у 1918 годзе, беларусы зрабілі спробу стварыць незалежную дзяржаву, — заслугоўвае павагі». Пасля гэтага «круглага стала», з'явіліся шматлікія публікацыі і ў іншых дзяржаўных СМІ. Аднак ані мемарыяльных знакаў, ані адмысловых выставаў, экспазіцыяў у музеях, бібліятэках, маштабных грамадскіх мерапрыемстваў улады не дазволілі. Тым больш каштоўнымі былі шматлікія ініцыятывы, імпрэзы, выставы і канцэрты, зладжаныя людзьмі самахоць, на грамадскіх пачатках у Гродне, Мінску, Брэсце... А ў Парэччы сельскія ўлады ўсталявалі мемарыяльную табліцу першаму кіраўніку БНР Раману Мар'яну Скірмунту.

Увосень прайшлі розныя мерапрыемствы ў памяць ахвяраў Халакосту, да 65 гадоў знішчэння Мінскага гета. Былі адкрытыя новыя мемарыяльныя знакі і помнікі на Юбілейнай плошчы і на вуліцы Сухой. Гэтым разам маштаб мерапрыемстваў быў куды большы чым раней — удзельнічаў кіраўнік дзяржавы. Але гэтыя жалобныя ўрачыстасці раскрылі і бездань няведання беларусамі адной з самых жудасных старонак нашае гісторыі.

### Перастаўленыя класікі

У 2008 годзе былі знішчаныя дзесяткі помнікаў архітэктуры і археалогіі па ўсёй краіне. Да *Дажынак* у Оршы знішчылі будынак старасвецкай карчмы на вуліцы Пралетарскай, 2, вакзальны гатэль, пабудаваны на пачатку XX стагоддзя, на вуліцы Дзяржынскага і будынак прыстанцыйнай школы 1905 году. Тамсама, у Оршы, перанеслі помнік Караткевічу, каб на яго месцы зрабіць туалет...

А ў Мінску, нягледзячы на меркаванне шаноўных дзеячаў культуры, на месцы помніка Максіму Багдановічу будуюць дэкаратыўны фантан. На вуліцы Рэвалюцыйнай, 17 толькі адрамантаваны будынак XVIII — пачатку XIX стагоддзя быў знесены, бо перашкаджаў узвядзенню новага бетоннага гмаху. Зруйнаваныя дамы па вуліцы Камсамольскай, 11а і часткова 15. Знакавым здарэннем для характарыстыкі стану аховы помнікаў у краіне стала **разбурэнне вежы Пішчалаўскага замку (на фота)**.

### Было на што паглядзець

Цікава гэты год прайшоў для аматараў выяўленчага мастацтва. Працягвала экспанавацца выдатная выстава Пікаса, Лежэ і ягонае жонкі Надзеі Хадасевіч са збораў нашага Нацыянальнага мастацкага музею. Шкада, што гэтая выстава не засталася стацыянарна ў асноўнай экспазіцыі. Тамсама, у Мастацкім, прайшла унікальная вялікая выстава твораў Ніко Пірасманішвілі. Такой выставы Пірасмані няма нават у Грузіі, пагатоў цяпер, пасля вайны з Расіяй.

Сенсацыяй адыходнага году стала выстава ARSincognita ў Акадэміі навук. Яна сабрала прызнаньня не толькі шырокай публікі, але і навукоўцам творы Драздовіча, Сергіевіча, Сеўрука, Вішнеўскага, Крачкоўскага.

У сакавіку ў Палацы мастацтваў прайшла кранальная і змястоўная выстава твораў славутага мастака, суаўтара эталону дзяржаўнага гербу «Пагоня» Яўгена Куліка. Усцешыла выстава ў лістападзе твораў Ізраіля Басава «Вяртанне ў горад» у Нацыянальным мастацкім.

Забаўная канцэптуальная выстава «Арт-Бульба» была ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». Дзіўна, але гэта адзінае яркае мерапрыемства, што прайшло ў міжнародны год бульбы. Анансаванага шырока адкрыцця помніка Бульбе на праспекце Пераможцаў так і не адбылося. У салоне-галерэі «Падземка» прайшла цікавая выстава твораў Міхаіла Гуліна, Руслана Вашкевіча, Зоі Луцэвіч — якія цэнзура не дапусціла да Першага біенале сучаснага мастацтва. Тая экстраная выстава стала альтэрнатываю біенале.

Унікальную магчымасць паглядзець на слуцкія паясы стала іх выстава з маскоўскіх збораў у Мастацкім.

З іншых выставаў гістарычнага плану зацемім экспазіцыю скандальна вядомага Пояса Вітаўта і Радзівілаўскай карты ў Гістарычным музеі, а таксама магнацкіх партрэтаў у Мастацкім.

Нарэшце, у снежні, у прыстойнай КЗ «Мінск» прайшлі канцэрты «Народнага альбому», што я лічу найцікавейшай падзеяй нашага музычнага жыцця сёлета, роўна ж як і нечакана прадстаўнічы і шумны канцэрт афіцыёзнай беларускай эстрады ў Варшаве.

**10 найлепшых выставаў году**

Пікаса, Лежэ і Хадасевіч у Мастацкім

Пірасмані ў Мастацкім

Заходнебеларускіх масткоў віленскай школы ARSincognita ў Акадэміі навук

Слуцкіх паясоў у Мастацкім

«Арт-Бульба» ў Галерэі Універсітэту культуры

Яўгена Куліка ў Палацы мастацтваў

Ізраіля Басава «Вяртанне ў горад» у Мастацкім

Да юбілею Язэпа Драздовіча ў Палацы мастацтваў

Да юбілею Дуніна-Марцінкевіча ў Палацы мастацтваў

# Задала «Тройца» жару ў «Казе»

25 снежня этна-трыо прэзентавала свой новы альбом. У той жа дзень у Мінску адбыўся вялікі сольны канцэрт гурту. Як і абяцалі — з сюрпрызамі.



GENERATION.BY

Акурат на каталіцкае Раство этна-трыо «Тройца» прадставіла новы альбом «Жаржар». У той жа дзень у Мінску адбыўся вялікі сольны канцэрт гурту. Чарговая праца будзе без перабольшання нечаканай для прыхільнікаў творчасці «Тройцы». Як і абяцаў раней Іван Кірчук, кампазіцыі ў новым альбоме загучалі «цяжэй». Над «Жарам-жарам» эксперыментавалі Андрэй Жукаў, у чыёй студыі рабіўся запіс, Яўген Калмыкоў — каардынатар праекту. У запісе бралі ўдзел запрошаныя музыкі Сяргей Кунцэвіч і Аляксандр Старажук. «Мы рабілі альбом тры з паловай гады і нарэшце забралі яго ў Жукава, бо ён і далей над ім эксперыментаваў бы», — пажартаваў Іван Кірчук, пачынаючы канцэрт у мінскай «Казе» (народная назва канцэртнай залі, зважаючы на рэпертуар «Тройцы», пасуе ў дадзеным выпадку як ніколі).

Гралі музыкі ў традыцыйным складзе — Іван Кірчук ды два Юр'і — Дзмітрыеў з Паўлоўскім. З новага альбому прагучала некалькі кампазіцый у акустыцы — саўндтрэк да фільму «Цень самурая», «Тры Янгалы», «Удоль па рэчачцы» ды «Трыпціх». Апошнюю Кірчук не параіў слухаць на ноч, «бо не заснеце». Для таго, каб выканаць «эксперыментальныя» творы як на дыску, давядзецца запрашаць яшчэ пятнаццаць чалавек, патлумачыў лідэр «Тройцы».

У той вечар Іван Кірчук шмат жартаваў. «А зараз вясельная песня з галашэннямі дзяўчыны, а пасля хлопца. Цяпер маладыя не плачуць на вяселлі, хіба толькі на другі дзень, калі машыну ім не падораць». Пачынаючы купальскую «А ў гародзе, на канапельцы», Кірчук прыгадаў нашых продкаў, якія «розныя зёлкі ў гародзе сеялі, каб імі пасля прусакоў з хаты выганяць ды ў гэтым былі мудрэйшыя за галандцаў, якія тыя зёлкі кураць». «Сем чарак гарэлкі» — наш галоўны гімн цвярозасці. Пра «Тройцу» рознае гавораць. Нібыта як паслухаеш пасля сямі чарак гарэлкі нашы песні, то на раніцу галава не баліць. Але гэта хіба толькі пасля сямі чарак, бо пасля васьмі, ці дзевяці чарак мы ўжо не дапаможам», — перасцярог публіку галоўны музычны чараўнік краіны.

Падышла чарга пахваліцца новым дыскам. «Тут ёсць усё — казка пра зайца-свата і песня з клiпам, запісаная ў Чарнобылі, — «Тры янгалы». — Тут музыка стаў сур'ёзным. — Яна прымушае задумацца. Не пра крызіс, а пра душу. Бо ўсё ў раі будзем».

Адным з сюрпрызаў вечару, як прызнаўся Кірчук, была адсутнасць у праграме калядных песень. Зіма ў нас самі бачыце якая: то снег, то дождж. Але хутка ўжо і вясна прыйдзе. «Слухайце «Яблынь мая», і няхай у вашых душах зацвітуць сады», — пажадаў ён. Дзеля справядлівасці адзначым, што адна песня са словамі «Святы вечар» такі прагучала.

Расчуленыя адданасцю мінскай публікі, музыкі выйшлі колькі разоў на біс ды развіталіся «Жураўамі».

**Сямён Печанко**



# Журавіны

**Фотарэпартаж году.**

Растуць журавіны на балотах. Для мяне шлях у ягады выдаўся нялёгкі — ад дарогі, дзе мы кінулі машыну, да месца, дзе растуць журавіны, ішлі больш за гадзіну. У гумовых ботах, па вадзе. Затрымаешся на хвілінку — багна цягне ўніз. Пакуль выпрастаеш адну нагу, другая ўжо ў балоце.

Жанчыны з вёскі Боркі (Ганцавіцкі раён) ходзяць па журавіны амаль штодня, ад верасня да першага снегу. Набіраюць па 20, а некаторыя нават па 40 кілаграмаў за раз. Затым здаюць ягады, у вёсцы ёсьць нарыхтоўчы пункт. Хто мае сілы, вязе на продаж у буйныя гарады — у Менску на Камароўцы кілаграм ягады каштуе ад 3500 да 5000 рублёў.

Праца надзвычай цяжкая, але як жыць, калі пенсія 200-300 тысячаў?

**Юлія Дарашкевіч**









# Навагодняя пісанка

Піша **Віталь Тарас**.

### Ялінка, запаліся!

У гераіні савецкага анекдота — кабеты сталагa веку — запытвалі: «Што Вам больш даспадобы — мужчыны ці Новы год?» — «Канечне, Новы год, — адказвала тая. — Бо ён жа часцей». Тут цікавы не столькі пошлы сэнс анекдота, колькі той факт, што Новы год для ўсіх савецкіх людзей сапраўды быў своеасаблівым сімвалам шчасця, прынамсі, яго заменнікам. Ніякія іншыя савецкія святы — Першамай, ці Кастрычнік — ні ў якае параўнанне з навагоднім не ішлі.

Для мяне, як і для многіх маіх аднагодкаў, навагодняе свята — гэта чароўны пах елкі, мандарынаў, шакаладных цукерак, бенгальскія агні. А яшчэ — салата аліўе з курыным мясам і грэцкімі арэхамі, ад якой можна язык праглынуць. А яшчэ смажаная гусь з яблыкамі. А яшчэ смачны яблычны «Сідр» з вясёлымі хмялістымі бурбалкамі, які мой дзядуля ў адсутнасць бацькоў таемна наліваў мне, зусім малому, у сапраўдны бакал для шампанскага.

А самае галоўнае — гэта быў салодкі пачатак неймаверна даўгіх школьных вакацыяў. Цэлых дзесяць дзён можна было не хадзіць у ненавісную школу!

Ну, і што ад гэтага цяпер засталося? Вакацыі для дзяцей і дарослых даўжынёй дзесяць дзён чамусьці ўжо не радуюць. Ясная справа — старасць не радасць. Раней жа і сонца мацней свяціла, і трава была зелянейшай. Але чамусьці падазраю, што мандарыны з апельсінамі сёння нават дзецям ужо не прыносяць тае фантастычнае радасці. А чаго так ужо радавацца, калі мандарыны ёсць у продажы круглы год? Як казаў адзін мой знаёмы, «не хацелі жыць багата, але ж давялося...»

Шампанскае (хай сабе і не «Дон Перыньён», а «брут» з Мінскага заводу шумлівых вінаў — таксама неблагі напой, хоць і з яблыкаў, яго нават Бі-Бі-Сі рэкламавала ў сваім рэпартажы) ліецца ракой амаль штодня. Былі б грошы. І салата аліўе ўжо нікому не падаецца экзатычнай. (Сапраўдная салата ад Люсьена Аліўе гатавалася з мяса рабчыкаў, цялячага языка, чорнай ікры, свежай салаты і згатаваных ракаў. Да гэтага дадавалі марынаваныя агуркі, каперсы, яйкі і запраўлялі ўсё соусам правансаль.)

Дый святаў, быццам бы, стала больш — тут табе і каталіцкія Каляды, і праваслаўныя. І навагодні «аганёк» можна выбіраць на экране адразу на многіх тэлеканалах, у тым ліку, і на беларускіх, і сустракаць Новы год можна разам з Масквой, потым паводле мінскага часу, потым разам з Варшавай, потым з Лонданам, Нью-Йоркам і гэтак далей...

А шчасця ўсё адно няма.

Можа быць, гэта маё суб'ектыўнае пачуццё. Дый хто сказаў, што шчаслівым можна быць толькі ў навагоднюю ноч ці на Каляды?

Але ж у мяне ўражанне, што рэальнага пачуцця шчасця няма сёння нават у Рыо-дэ-Жанейра. Бачылі самую высокую плывучую калядную елку ў свеце, якую запалілі ў гэтым бразільскім горадзе, проста на моры? Колькі было на ёй агеньчыкаў, анёлкаў, які быў шыкоўны феерверк?

Але ж у Дубаі, дзе адчынілі незадоўга перад тым новы турыстычны комплекс, агнястрой быў яшчэ больш шыкоўны. Кажуць, больш магутны нават, чым на адкрыцці Пекінскай алімпіяды. А ці бачылі вы ялінку ў вокнах вашага суседа? Не яліна — сапраўдная міні-электрастанцыя, ад якой увесь снежань і студзень ззяе за шкельцамі ўсімі колерамі вясёлкі навагодняя ілюмінацыя.

### Гэты шматпалярны свет

Чалавецтва, нібы малое дзіцянё, любіць святы і намагаецца іх прыспешваць. Пачатак XX стагоддзя з вялікай помпай адзначылі ў 1900, хоць пачалося яно, насамрэч, стрэлам у Сараеве ў 1914.

XXI стагоддзе пачалося неўзабаве пасля ўрачыстага святкавання Міленіуму — 11 верасня 2001. Не ўсе тады гэта зразумелі. Што пачалася новая эпоха, давялося нагадваць у Мадрыдзе, потым у Лондане, цяпер вось у індыйскім Мумбаі.

Але што нам Гекуба? Што нам далёкая Індыя? У Мінску ўсё пакуль абышлося некалькімі параненымі на праспекце Пераможцаў. Як кажуць, вядзецца следства.

Тым часам расійскі пасол у Мінску Сурыкаў працягвае нецярпліва пагрукваць пальцамі па стале, нагадваючы пра патрабаванне Масквы, каб саюзнік прызнаў незалежнасць Паўднёвай Асеціі з Абхазіяй: «Ждём-с...»

А Нікаля Сарказі, якому выпала старшыняваць апошнія паўгоду ў ЕС, ва ўпор, што называецца, не бачыць агрэсіі Расіі ні ў дачыненні да Грузіі, ні ў дачыненні да іншых постсавецкіх краінаў. І заклікае да добрасуседскіх узаемакарысных адносінаў. Гэта называецца палітычным рэалізмам. Ці ўціхамірваннем агрэсара?

Пакуль Крэмль і яго хаўруснікі працягваюць распавядаць казкі пра «шматпалярны» свет, планета можа назіраць вынікі тае самае шматпалярнасці ва ўсёй яе прыгажосці і ў поўным маштабе. Пакуль ЗША залізваюць раны няўдалага прэзідэнцтва Джорджа Буша-малодшага ды фінансавага крызісу, самалійскія піраты захопліваюць усё новыя караблі з экіпажамі. Няма сёння «сусветнага жандара». Няма каму і ставіць бандытаў на месца. НАТО неахвотна рэагуе на пагрозы на Афрыканскім Рогу. Паўночна-Атлантычнай Асамблеі нават лянота прадэманстраваць свае мускулы. Млявая лаянка з Масквой (прадстаўнік Расіі ў гэтай арганізацыі Рагозін нядаўна назваў натаўцаў сабакамі) — вось і ўсё, што засталося, вонкава, ад некалі пагрозлівай арганізацыі, якой раней палохалі дзяцей. А таксама, дадам, асабліва тупых дыктатараў, патэнцыйных агрэсараў і тэрарыстаў ва ўсім свеце.

На вуліцы хамасу, аль-каіды, ахмадзінеджадаў і «дэкканаў» усіх колераў сёння свята. Бараку Абаму на ўсялякі выпадак намякнулі, каб ён больш не сустракаўся з рабінамі. У юдэйскім культурным цэнтры ў Мумбаі тэрарысты забілі ўзятых у закладнікі рабіна і ягоную жонку. І яшчэ 200 чалавек па ўсім горадзе.

А можа, фінансавы крызіс, нарэшце, прывядзе большую частку чалавецтва, захопленага спажываннем і таннымі распродажамі, у прытомнасць і прымусіць яго зразумець, што наспеў новы час? (Трэба заўважыць, што крызіс стаўся гэтулькі ж нечаканай і невытлумачальнай з'явай, як прыход восені пасля лета). 80% апытаных нядаўна ў Расіі заявілі, што пра крызіс яны чулі, але нічога не жадаюць ведаць пра яго і нічога не стануць у сувязі з ім рабіць. Штосьці мне падказвае, што прыкладна так адказала б і большасць грамадзян Беларусі. Ніяк не хочацца ўставаць з ложку рынкавага сацыялізму. Хоць там ужо клапы завяліся і анучамі ўсё прасмярдзела, але ж у ложку цёпла. Пад Новы год крыху правертым прасціны — і назад, у бацькаў ложак.

### «Дык як...»

Трапілася пад рукі кніга класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага. Перачытаў ягоныя праграмныя артыкулы «Наш тэатр» і «Развагі і думкі», упершыню апублікаваныя ў віленскіх выданнях «Калядная пісанка» (1913) і «Велікодная пісанка» (1916), калі нікому не трэба было тлумачыць, што такое «пісанка». Яйкі тады распісвалі не толькі на Вялікдзень. Зразумела, слова «пісанка» мае і другое значэнне, што і выкарысталі выдаўцы ў тых назвах.

Можна толькі здзіўляцца, наколькі артыкулы Гарэцкага, напісаныя амаль сто гадоў таму, застаюцца актуальнымі сёння. Напрыклад, з «Развагі і думак»: «Вот тут-то я і звярнуся да "генералаў" адраджэння, кіраўнікоў руху...Тут я скажу ім: смялей гаварыце новае слова народу беларускаму! Смялей!! Менш уважайце на напасці з польскага і расійскага боку. Менш азірайцеся на іх. («Цыт. па: «Максім Гарэцкі. Творы, Мінск, «Мастацкая літаратура», 1990 — ВТ)

Ці вось яшчэ: «І мутарна як на сэрцы, што многія «ў чорным» беларусы, пахваліўшыся, што знаюць беларускую мову, умеюць толькі зламаць «дык, як...». А потым думаюць, што і напраўдзе мова бацькоў іх такая ўбогая». (Тамсама — ВТ)

2008 год для мяне суб'ектыўна застанецца годам стратаў і расчараванняў. Усё, што адбылося па-за межамі Беларусі, у дадзеным выпадку пакідаю без каментароў (як, напрыклад, падзеі ў М'янме або смерць Аляксандра Салжаніцына).

Сёлета ў Мінску пайшлі з жыцця паэт, франтавік Аляксандр Дракахруст і ягоная жонка Дзіна Манаева, з якімі шмат гадоў, а па сутнасці — усё жыццё сябравалі мае бацькі...

Не стала гісторыка і літаратуразнаўцы Генадзя Кісялёва, літаратара Алега Лойкі.

Увесну хавалі Ірыну Казуліну. Хоць тут адразу хочацца ўспомніць і пазітыўнае. Усяго праз некалькі месяцаў пасля таго пахавання вызвалілі з турмы Аляксандра Казуліна, іншых палітзняволеных.

А вось на выбарах у палату прадстаўнікоў, насуперак прагнозам, не прайшоў ніводзін кандыдат ад апазіцыі.

Затое пры канцы году ў шапіках з'явіліся «Народная воля», «Наша Ніва».

Перад тым спыніўся выхад незарэгістраванай газеты «Свабода». Яна праіснавала два з паловаю гады і зачынілася праз фінансавыя праблемы, хоць колькасць падпісчыкаў падпольнага выдання дасягнула дзвюх тысяч. Як выказаўся адзін з выдаўцоў, у сённяшняй Беларусі, відаць, само слова «свабода» пакуль яшчэ не прыжылося.

Ну, а як мы адзначым Новы год? Як казаў адзін савецкі кінаперсанаж, ёсць указанне сустрэць яго весела. Нават з яшчэ большым імпэтам і весялосцю, чым раней. І якая розніца, што паўсюль ізноў будуць п'яныя Дзядулі Марозы з Снягуркамі?

Чароўная дзіда гісторыі ўсё адно ў руках Бога Святла.

### ЗДЫМКІ ГОДУ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У 2008 годзе выйшлі на волю палітвязні. Шчаслівы Зміцер Дашкевіч п'е чай з беляшамі ў буфеце аршанскага вакзалу.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Амаль дэтэктыў

19 снежня невядомымі быў выкрадзены і жорстка збіты палітычны актывіст і былы палітвязень **Артур Фінькевіч**.

Недзе а пятай вечара Артур выйшаў на ганак дому, што на вуліцы Парніковай (там хлопец здымае кватэру). «Адразу на мяне са спіны напалі нейкія людзі, збілі з ног, накінулі на галаву вялікую зімовую шапку і пацягнулі ў мікрааўтобус. Пакуль цягнулі, пастаянна збівалі», — кажа лідэр «Маладой Беларусі».

Артур гаворыць, што спрабаваў супраціўляцца, крычаў «Памажыце!», але ўсё марна. У мікрааўтобусе збіццё працягвалася, а паколькі на галаве была шапка, то вызначыць, хто збіваў і колькі чалавек — было цяжка.

Фінькевіч ацэньвае колькасць тых, хто на яго напаў у восем асобаў. «Яны брыдка лаяліся, пастаянна паўтаралі «Ну ўсё табе, п...ц, пацан».

**Артур Фінькевіч**

нарадзіўся 8 лютага 1985 у Мінску. Браў удзел у «Маладым фронце». Адбываў пакаранне за палітычную дзейнасць на «хіміі» і ў калоніі. Цяпер стварае рух «Маладая Беларусь».

Спачатку Артуру чамусьці падалося, што яго вязуць убок Смаленску. Што праўда, адвезлі яго ў адваротным кірунку. «Быў рэальны страх, што мяне могуць расстраляць ці нешта такое. Усю дарогу маліўся. Выкінулі мяне праз тры гадзіны недзе ў лесе пад Валожынам, ля вёскі Падбярэзь. Выкінулі з звязанымі рукамі і шапкай на галаве. Урэшце я высвабадзіў рукі. Некалькі кіламетраў ішоў да дарогі, пакуль не выйшаў на віленскую трасу. Спыніў фуру з літоўскімі нумарамі. Кіроўца — яго звалі Рэмігідыуш — падабраў мяне і адвёз дахаты — ён жыве ў вёсцы пад Валожынам (12 км ад гораду)», – кажа былы палітвязень.

Жонка кіроўцы выклікала валожынскае таксі, якім Артур дабраўся да Мінску. Адразу па прыездзе ў сталіцу хлопец скіраваўся ў РУУС Першамайскага раёну пісаць заяву аб збіцці. У хлопца насамрэч быў вялікі фінгал пад правым вокам, а таксама была парваная куртка.

У пастарунку хлопец правёў ці не ўсё ноч. Міліцыянты прычапіліся, што ў Артура не было з сабой пашпарта, які выцягнулі з кішэні выкрадальнікі. З кішэняў, дарэчы, забралі ўсё – дакументы, партманэ (там было каля 240 тыс.), ключы, мабільны тэлефон.

На наступны дзень міліцыянты правялі ператрус у кватэры, якую ён здымаў. Прычым адбывалася гэта ў той час, калі Артура не было дома.

Паводле Артура, былі канфіскаваныя сцягі, газеты, матэрыялы, датычныя дзейнасці «Маладой Беларусі», нататнікі, а таксама парваная куртка, якая была на ім падчас выкрадання.

Самому Артуру Фінькевічу ніякіх тлумачэнняў з нагоды ператрусу не далі. Гаспадар жа кватэры заявіў, што нікому яе не здаваў.

Па факце збіцця Артура Фінькевіча была заведзена крымінальная справа паводле артыкулу 206 Крымінальнага кодэксу. Дзеянні злачынцаў міліцыянты расцэньваюць як рабаўніцтва.

**Зміцер Панкавец**

## СЦІСЛА

### Снегіра не лякуюць

Былы пракурор Мінскай вобласці Міхаіл Снягір утрымліваецца ў СІЗА, заявіў генпракурор Беларусі Рыгор Васілевіч. Ён абверг інфармацыю некаторых СМІ, што Снягір ляжыць у лякарні.

### Славацкія ксяндзы не хочуць служыць у Беларусі

«Я звяртаўся да Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Славакіі, каб яны даслалі нам ксяндзоў, але ніхто не захацеў ехаць у Беларусь», — сказаў арцыбіскуп Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч, адказваючы на пытанне пра высылку з Беларусі польскіх ксяндзоў. Сёння ў нашай краіне працуе 440 каталіцкіх святароў. На думку мітрапаліта, каб весці паўнавартасную душпастарскую дзейнасць неабходна як мінімум 700.

### «Белсат» падаў паперы на рэгістрацыю

Прадстаўнік незалежнага тэлеканалу Міхась Янчук падаў 20 снежня ў Міністэрства замежных справаў Рэспублікі Беларусь дакументы на рэгістрацыю прадстаўніцтва «Белсату» як часткі Польскага тэлебачання (TVP S.A.) у нашай краіне. Паводле заканадаўства, «Белсат» павінен атрымаць адказ на працягу 2 месяцаў.

### КДБ затрымала камандзіра вайсковай часткі

Аператыўнікамі МУС сумесна з супрацоўнікамі аддзелу вайсковай контрвыведкі КДБ затрыманы камандзір в/ч 41780. Затрыманы палкоўнік падазраецца ў атрыманні хабару памерам 2,5 тыс. даляраў. Грошы яму перадаваў індывідуальны прадпрымальнік, які хацеў узяць у арэнду памяшканне на тэрыторыі в/ч 41780.

**ЗП**

# Адпушчаны былы старшыня «Белнафтахіму»

З бабруйскай калоніі вызвалены былы старшыня канцэрну «Белнафтахім» Аляксандр Бароўскі. Ён выйшаў на волю па акце памілавання кіраўніком дзяржавы. 27 сакавіка Бароўскі быў прыгавораны да пяці гадоў пазбаўлення волі. Па вызваленні Бароўскі найперш паехаў у царкву.

У арышце Бароўскага не было палітычных матываў, не было іх і ў вызваленні.

Раней турмы аналагічна пазбегла кіраўніца справаў прэзідэнта Жураўкова, што слёзна каялася перад Лукашэнкам.

# «Заклічніку Вячорку трэба з’явіцца 22 снежня ў ваенкамат»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Ваенкамат пайшоў насустрач лідэру апазіцыйнай моладзі.

У сям’і Вячоркаў палітыкай займаецца не толькі бацька Вінцук, але і сын Франак. Хлопец за тое пацярпеў: яго выгналі з журфаку. Цяпер спрабуюць забрыць у войска, а ён лічыць тое несправядлівым і асрэчае.

Калі яго прывезлі ў ваенкамат, Франак запатрабаваў, каб позву яму ўручылі на беларускай мове.

Давай вайскоўцы пісаць позву на мове, прыцягнулі слоўнік. У выніку ў першым сказе напісалі: «Заклічніку Франаку Вячорку трэба з’явіцца 22 снежня ў ваенкамат а 10-й раніцы».

Бо ў слоўніку знайшлі пераклад слова «призыв» — «заклік».

**МБ**



# Шмолік на Eurosport

Відэаролік пра беларускага футбольнага суддзю Сяргея Шмоліка паказвае Eurosport у рубрыцы прыколаў і проста смешных гісторый Watts. Нагадаем, што на матч 13-га туру чэмпіянату Беларусі па футболе між «Віцебскам» і наваполацкім «Нафтанам» суддзя выйшаў нецвярозым. Гэта дорага абышлося арбітру ФІФА і найлепшаму суддзю Беларусі: судовы камітэт Беларускай федэрацыі футболу дыскваліфікаваў яго пажыццёва.

**СП**

# 2009

## Студзень

**1** — Новы год.

**6** — Тры Каралі ў каталікоў, Вадохрышча ва уніятаў.

**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.

**19** — 200 гадоў таму (1809 г.) нарадзіўся Эдгар По, класік амерыканскай літаратуры.

**29** — 125 гадоў таму (1884 г.) нарадзіўся Антон Луцкевіч, палітык і публіцыст, адзін з стваральнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі, «Нашай Нівы» і Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

## Люты

**4** — Міжнародны дзень абароны ад раку.

**12** — 200 гадоў таму (1809 г.) нарадзіўся Чарльз Дарвін, стваральнік тэорыі эвалюцыі.

**14** — Дзень святога Валянціна.

**21** — Міжнародны дзень роднай мовы

**25** — 50 гадоў таму (1959 г.) памёр Клаўдзій Дуж-Душэўскі, палітык, грамадскі дзеяч, педагог, стваральнік эскізу беларускага нацыянальнага сцяга.

## Сакавік

**3** — Міжнародны дзень пісьменніка (заснаваны Міжнародным ПЭН-цэнтрам у 1986 г.).

**4** — 1484 г. памёр князь Казімір (сын вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча), прызнаны пазней святым. Свята літоўцаў Казюкас — у яго ны гонар.

**8** — Дзень жанчынаў.

**11** — Свята-карнавал Пурым у юдэяў.

**20** — Дзень нараджэння прарока Мухамеда.

**25** — Дзень Волі.

## Красавік

**1** — Дзень смеху.

**1** — 200 гадоў таму (1809 г.) нарадзіўся Мікалай Гоголь.

**10** — Песах у юдэяў.

**12** — Вялікдзень у каталікоў.

**19** — Вялікдзень у праваслаўных.

**26** — Дзень Чарнобыльскай трагедыі.

**28** — Радаўніца.

## Травень

**1** — Свята Працы.

**3** — Міжнародны дзень свабоды друку.

**5** — Дзень святой Ефрасінні Полацкай.

**9** — Дзень перамогі над фашызмам.

**9** — Дзень Еўропы.

**11** — Дзень святога Кірылы Тураўскага.

**24** — Дзень славянскага пісьменства.

**31** — Дзень народзінаў Буды (563 год да н.э.).

## Чэрвень

**1** — Міжнародны дзень абароны дзяцей.

**23** — Купалле.

**26** — 100 гадоў таму нарадзіўся Антон Адамовіч, пісьменнік, навуковец, публіцыст.

**27** — юбілей беларускага метро. 25 гадоў таму (1984 г.) уведзеная ў эксплуатацыю першая лінія мінскага метрапалітэну.

**28** — Сабор Беларускіх святых.

**29** — Пятра і Паўла ў каталікоў, уніятаў.

## Ліпень

**2** — Дзень Маці Божай Будслаўскай, апякункі Беларусі.

**7** — Святы Іван у праваслаўных.

**10** — 500 гадоў таму (1509 г.) нарадзіўся Жан Кальвін, французскі рэлігійны рэфарматар. У часы Рэфармацыі кальвінізм моцна пашырыўся на беларускіх землях.

**12** — Пятра і Паўла ў праваслаўных.

**18** — 100 гадоў таму (1909 г.) у вёсцы Вялікія Грамыкі (цяпер Гомельская вобласць) нарадзіўся Андрэй Грамыка, шматгадовы (1957—1985) міністр замежных справаў СССР, празваны на Захадзе праз сваю несаступлівасць «Містэр Не».

**25** — 25 гадоў таму (1984 г.) памёр Уладзімір Караткевіч.

## Жнівень

**6** — Перамяненне Божае ў каталікоў, уніятаў.

**15** — Спленне ў каталікоў, уніятаў.

**19** — Перамяненне Гасподняе (Яблычны Спас) у праваслаўных.

**21** — Пачатак Рамадану ў мусульманаў.

**28** — Успене (Прачыстая) у праваслаўных.

**16** — 600 гадоў таму (1409 г.) пачалася Вялікая вайна (вайна між ВКЛ і Польшчай супраць Тэўтонскага ордэну).

## Верасень

**8** — Дзень беларускай вайсковай славы.

**16** —150 гадоў (1859 г.) ад нараджэння Браніслава Эпімаха-Шыпілы, грамадскага дзеяча, мовазнаўца, выдаўца.

**17** — 50 гадоў таму (1959 г.) нарадзіўся Сяргей Дубавец, журналіст, першы рэдактар адроджанай «Нашай Нівы».

**20** — Канец Рамадану ў мусульманаў.

**20** — Рош Ашонэ (Новы год) у юдэяў.

**21** — Міжнародны дзень міру.

**27** — Узвіжанне Крыжа Гасподняга ў праваслаўных.

**28** — Міжнародны дзень глухіх.

**29** — Ём Кіпур (Дзень выкуплення грахоў) у юдэяў.

**30** — Міжнародны дзень перакладчыка.

## Кастрычнік

**1** — Міжнародны дзень музыкі.

**1** — Пакроў ва ўніятаў.

**14** — Пакроў у праваслаўных.

**26** — 50 гадоў таму (1959 г.) нарадзіўся паэт Анатоль Сыс.

**31** — Ірландска-амерыканскае свята Хэлоўін.

## Лістапад

**1** — Усе святыя ў каталікоў.

**2** — Дзяды.

**16** — Успамін (Дзень) Маці Божай Вастрабрамскай.

**28** — пачатак Піліпаўкі, посту перад Божым Нараджэннем у праваслаўных.

**28** — Курбан-байрам у мусульманаў.

## Снежань

**1** — Дзень абароны ад СНІДу.

**3** — Дзень бульбы. Лічыцца, што ў гэты дзень у Еўропу з Амерыкі была ўпершыню прывезеная бульба.

**10** — Дзень правоў чалавека.

**13** — Свята Ханука ў юдэяў.

**15** — 75 гадоў таму (1934 г.) нарадзіўся Станіслаў Шушкевіч, першы кіраўнік незалежнай Беларусі.

**27** — 150 гадоў таму (1859 г.) нарадзіўся Людвіг Заменгоф, вынаходнік мовы эсперанта, які доўга жыў у Беластоку і Горадні.

**17** — Дзень беларускага кіно.

**20** — 5 гадоў таму (2004 г.) забілі журналістку Вераніку Чаркасаву.

**25** — Божае Нараджэнне ў каталікоў, уніятаў, пратэстантаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### СНЕЖАНЬ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

### ЛЮТЫ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | |

### САКАВІК

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

### КРАСАВІК

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

### МАЙ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

### ЧЭРВЕНЬ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |

### ЛІПЕНЬ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

### ЖНІВЕНЬ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

### ВЕРАСЕНЬ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

### КАСТРЫЧНІК

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

### ЛІСТАПАД

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | | | | | | |

### СНЕЖАНЬ

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

# Уладзіміру Ісаенку — 80

Піша археолаг **Мікола Крывальцэвіч**.

15 снежня споўнілася 80 гадоў археолагу Уладзіміру Ісаенку, аднаму з заснавальнікаў нацыянальнай археалагічнай школы.

Уладзімір Фёдаравіч — аўтар вялікай колькасці навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, кніг, манаграфій па археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі. Толькі для энцыклапедый ім было напісана больш за 400 артыкулаў!

Ён нарадзіўся ў Горках Магілёўскай вобласці. Яго бацькі вучыліся ў той час у Сельгасакадэміі. У 1932 г. сям'я пераехала ў Мінск. Бацька У.Ісаенкі, камісар Чырвонай Арміі ў грамадзянскую вайну, працаваў у Наркамземе, трапіў пад сталінскія рэпрэсіі, але ацалеў. У час нямецкай акупацыі пайшоў працаваць аграномам у гарадзкую ўправу, пазней удзельнічаў у працы Беларускай Народнай Самапомачы.

Падлеткам спадар Уладзімір перажыў фашысцкую акупацыю Мінску. Вясной 1944 г. ён разам з маці і бабуляй быў вывезены ў паўднёвую Германію, дзе як гастарбайтар працаваў на ваенным заводзе, час ад часу трапляючы пад бомбы саюзнікаў. Затым быў Берлін зімой і вясной 1945 г. з жудасцямі татальнага знішчэння горада і людзей. Хлопцу прыйшлося жыць і хавацца «ў самым цэнтры, за два кварталы ад Ангальтэрбангоф, за тры — ад дому Гімлера, за чатыры — ад Рэйхсканцылярыі».

Ён захаваў пра вайну, у першую чаргу пра Мінск часоў фашысцкай акупацыі, яркія і рэалістычныя ўспаміны (гл. «Жыццё з галавой ў пятлі», ARCHE, №2, 1999).

У.Ісаенка — першы ў Беларусі археолаг, які паспрабаваў спалучыць прафесійны археалагічны досвед і грунтоўныя ваенныя веды ў пошуку невядомых пахаванняў часоў вайны. Да пачатку 2000-х ён працаваў на пасадзе археолага-кансультанта ў спецыялізаваным пошукавым батальёне.

...Вызваленне з палону прынесла новыя страхі за жыццё. Нечаканае выратаванне прыйшло ад стрыечнага дзядзькі, які да вайны служыў у НКВД. Ён накіраваў хлопца ў Гомель, дзе той змог закончыць школу і паступіць у педінстытут на фізіка-матэматычны факультэт. Па заканчэнні, як адзін з найлепшых студэнтаў, ён атрымаў рэкамендацыю на выкладанне ў ВНУ, але не скарыстаўся ёю, бо ведаў, якую праверку біяграфіі праходзяць інстытуцкія выкладчыкі. Ён апынуўся ў Юравічах — старадаўнім палескім мястэчку, дзе працаваў завучам, настаўнікам, а затым дырэктарам школы.

Юравічы набылі шырокую вядомасць дзякуючы адкрыццю ў 1929 г. палеалітычнай стаянкі. У канцы 1950-х У.Ісаенка пачаў арганізоўваць школьныя археалагічныя групы, абследаваў помнікі археалогіі ўздоўж Прыпяці.



**Уладзімір Ісаенка (справа) у час археалагічных раскопак на Піншчыне. 1978 г.**

Вялікая цікавасць перарасла ў жаданне заняцца археалогіяй прафесійна. У 1961 г. У.Ісаенка паступіў у аспірантуру Інстытуту гісторыі Акадэміі навук і пачаў працу над кандыдацкай дысертацыяй «Неаліт Прыпяцкага Палесся».

Штогадовыя археалагічныя разведкі і раскопкі дазволілі яму давесці колькасць палескіх неалітычных помнікаў да 500. Уражвае аб'ём сабранага археалагічнага матэрыялу — сотні тысячаў артэфактаў! Многія абследаваныя помнікі, а гэта найчасцей пясчаныя палескія дзюны, не захаваліся да нашага часу. Частка знішчалася падчас меліярацыі Палесся. Пры ліквідацыі наступстваў радыеактыўнага забруджвання шмат помнікаў выкарыстоўвалася пад кар'еры і могільнікі. Палескія калекцыі У.Ісаенкі можна па праву называць фондам выратаваных археалагічных каштоўнасцяў.

Крытыцызм і абачлівасць — адны з найбольш характэрных рысаў У.Ісаенкі як навукоўца і чалавека. Ён імкнецца рэалістычна глядзець на свет, па-свойму ацэньвае жыццё, вучыць верыць у свае сілы і спадзявацца толькі на сябе.

У сувязі з 80-годдзем хацелася б выказаць спадару Уладзіміру падзяку за тыя дарагія мне сэрцу часы сумесных раскопак і вандровак па Палессі, а таксама за шчырыя і карысныя для мяне вечаровыя гутаркі на беразе Пагосцкага возера ды ў пранасторных пакоях колішняй старасвецкай школы мястэчка Пагост-Загародскі. Я, а таксама мае калегі, зычаць Вам добрага здароўя і веры ў сваю моц.

**Мікола Крывальцэвіч, гісторык**

## ВОДГУКІ

### І тут бульбаш

**Чытацкія водгукі на сігнал у «Нашу Ніву» жыхара Віцебску Сяргея Каваленкі наконт абразлівай для беларусаў назвы гарэлкі «Бульбашъ» («НН» №45'2008) уразіў і мяне, вашага даўняга падпісчыка.** Цалкам падзяляю яго погляды і тых чытачоў, што даслалі свае водгукі. У гэтым плане і горад Слуцк не выключэнне: тут ужо гады з два на мясцовым хлебзаводзе выпякаюць хлеб «Бульбаш». На мой тэлефонны званок дырэктару заводу ён адказвае, што вы, маўляў, першы з жыхароў раёну, каго гэта абурыла, пакупнікі ахвотна купляюць хлеб. Мы яго нават у Мінск адпраўляем, бо ён не горш па смакавых якасцях за тутэйшы «Нарачанскі»… Але ўсё ж паабяцаў «разабрацца». Што ж, пачакаем.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцк**

### Наша першая граматыка — у Ватыкане?

**Падзяляю агульную думку «Удакладнення» Язэпа Янушкевіча пад назвай «Кротус Генус ніколі не быў за мяжой» («НН» №47'2008).** Сапраўды, незабыўны Генадзь Кісялёў ніколі не бываў за межамі СССР. Здаецца, нават не імкнуўся: яму хапала віленскіх архіваў.

Але ж, удакладняючы адно, спадар Янушкевіч сам напрошваецца на ўдакладненне. Пералічваючы даследчыкаў, якія выязджалі за граніцу, ён піша нібыта пахвальна, але недакладна: «Не кажучы пра Адама Мальдзіса, які прашнураваў архівы Еўропы ад Паўночнай Англіі да паўднёвай Італіі». Дальбог, ніколі там не быў. Бо Лондан і Оксфард — гэта не паўночная Англія, а Рым, Падуя і Венецыя — гэта не мафіёзны поўдзень Італіі. Дарэчы, у Італіі я нічога ў архівах не «шнураваў», бо быў там на канферэнцыях і адкрыцці мемарыяльнай дошкі Францыску Скарыну. Вядома, хацелася б пасядзець у Ватыкане над фондам Магілёўскага архібіскупа Станіслава Богуша-Сестранцэвіча, дзядзькі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, каб адшукаць там ці ні першую новабеларускую граматыку, складзеную архіпастырам, — але для гэтага не знайшлося магчымасці.

Затое, дзякуючы італьянскаму прафесару Сантэ Грачыоці атрымаў для Скарынаўскага цэнтру цэлых 27 тамоў апісанняў матэрыялаў Рэчы Паспалітай у заходнееўрапейскіх архівах. Вылоўліваць там беларускія пазіцыі — адно задавальненне. І яго атрымаў малады гісторык Яраш Малішэўскі, займаючыся гэтым вылоўліваннем для восьмага выпуску «Вяртання», які нарэшце павінен выйсці ў свет у выдавецтве «Літаратура і Мастацтва». А ці захаваўся сам найкаштоўнейшы 27-томавік пасля перадачы кніг Скарынаўскага цэнтру дзяржпедуніверсітэту — дужа сумняюся. Занадта багатая гэта крыніца інфармацыі…

**Адам Мальдзіс, Мінск**

### Помню лясных бандытаў

**Дзякуй шаноўнай спадарыні Але Петрушкевіч з Гродна за артыкул «Расстрэл у гонар Першамая» («НН» №46'2008).** Пра лясных бандытаў я тое-сёе помню, а самае галоўнае, што гаварыў бацька нябожчык: калі яму камандзір атраду прапаноўваў дакументы, што сям'я памагала ім. Ён адмовіўся і сказаў, што вам як бандытам я памагаў, я вас не любіў, і для сям'і маёй такія дакументы вялікая абраза. Бо бальшавікі, апроч як знішчаць сумленных людзей, нічога рабіць не ўмеюць.

**Анастас Семяновіч, Бараўляны (Мінскі раён)**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

## ЗДЫМКІ ГОДУ




**Лідэр Лівіі Муамар Кадафі і першы віцэ-прэм'ер беларускага ўраду Уладзімір Сямашка. З чыйго пляча апранаецца віцэ-прэм'ер? — смяяліся інтэрнаўты пасля публікацыі гэтага фота.**




# ЗБЯРЫ КНІГАРНЮ «НАША НІВА»

ПЫТАЙЦЕСЯ Ў КНІГАРНЯХ І Ў НЕЗАЛЕЖНЫХ РАСПАЎСЮДНІКАЎ











































































# Як мы без гэтага жылі?

*Мне ўжо цяжка зразумець, як мы жылі без Лігі чэмпіёнаў. Але яшчэ цяжэй уявіць, як можна пражыць без усяго гэтага далей...*
*Віктар Ганчарэнка, 28 лістапада 2008*

Тыя, хто жыў на пачатку 1980-х, мелі сваю каманду-легенду. Гэта было фантастычнае мінскае «Дынама» ўзору 1982 году. Тады маладняк Эдуарда Малафеева пакінуў за сваімі спінамі ўсе маскоўскія клубы, кіеўскае і тбіліскае «Дынама» і ўпершыню ў гісторыі заваяваў залатыя медалі. І сёння нашы бацькі з настальгіяй узгадваюць хет-трык абаронцы Юр'я Курненіна ў матчы з казахскім «Кайратам», страшэнна таленавітага Аляксандра Пракапенку, звышнадзейнага Сяргея Бароўскага, маладых ды ранніх Сяргея Алейнікава і Андрэя Зыгмантовіча, веселуна Юр'я Пудышава, фенаменальнае галявое пачуццё Ігара Гурыновіча.

За прамінулыя 26 гадоў беларускі футбол так і не разжыўся вялікімі перамогамі. Таму і даводзіцца год за годам слухаць пра той поспех «Дынама». Маладзейшым жа заставалася толькі ўспамінаць шалёны гол Сяргея Герасімца ў вароты галандцаў.

Нечага больш глабальнага мы ўсе даўно ўжо зачакаліся. Галоўныя спадзяванні былі на зборную Бернда Штанге, але прыемнае прыйшло адтуль, адкуль чакалася найменш.

Згадваецца лістапад 2007 году, калі з стану барысаўскага БАТЭ прыйшла нечаканая навіна, што каманду пакідае яе галоўны трэнер Ігар Крывушэнка, які прывёў каманду да двух чэмпіёнскіх тытулаў. Яшчэ больш здзівіла кадравае рашэнне генеральнага дырэктара БАТЭ Анатоля Капскага прызначыць галоўным трэнерам 31-гадовага Віктара Ганчарэнку. У такім узросце гульцы яшчэ нават не задумваюцца аб сканчэнні кар'еры, не тое каб узначаліць наймацнейшы клуб краіны.

Ганчарэнку праз цяжкую траўму давялося рана скончыць гуляць. Вось як ён згадвае гэты эпізод з жыцця на сваім блогу: «Ляжаў яшчэ ў паўсвядомым стане пасля наркозу, як зазвінеў тэлефон. «Віць, ты ведай, як бы што ні склалася, мы цябе ўсё адно не кінем. Калі што — будзеш працаваць у клубе». Анатолевіч вельмі дакладна ўгадвае самыя патрэбныя словы. І час, калі мы хочам іх пачуць...»

Спачатку Віктар Ганчарэнка стаў намеснікам трэнера дубля, потым сам узначаліў другі склад БАТЭ, пазней перспектыўнаму спецыялісту прапанавалі дапамагаць Крывушэнку ў аснове. Ганчарэнка прызнаецца, што ведаў бракавала катастрафічна. Але штодзённай напружанай працай атрымлівалася змяншаць колькасць прабелаў. Дапамагалі былыя калегі — варатар Юра Жаўноў, які зладзіў стажыроўку ў Маскве, а таксама Віталь Кутузаў, які расказваў пра заняткі трэнераў, пад чыім кіраўніцтвам выступаў.

А вось як Ганчарэнка згадвае прапанову стаць настаўнікам БАТЭ: «У той лістападаўскі вечар званок Капскага быў сюрпрызам: «Ты гатовы прыняць каманду?» Праз гадзіну Анатоль Анатолевіч быў ужо ў нас дома. Я яму сказаў, што гатовы. Напэўна, у мяне не было права адмовіцца. Адразу ўявіў, як баюся і кажу «не», а назаўтра ў БАТЭ прыходзіць хтосьці невядомы, чужы. І ўсё, што так доўга і карпатліва стваралася, можа змяніцца. Непапраўна. Беззваротна».

Чытаючы Ганчарэнку, разумееш, што поспех каманды, дзе не кідаюць у цяжкіх сітуацыях сваіх, быў напазбежны. Занадта многа сілаў, энергіі, часу і здароўя было закладзена ў гэтыя перамогі. І найлепшая тут ілюстрацыя — гэты непадробны страх Ганчарэнкі, што ў каманду можа прыйсці чужы чалавек, які не ведае традыцый БАТЭ.

Ганчарэнку было нялёгка. У пачатку сезону каманда без варыянтаў прайграла ў Кубку МТЗ-РІПА, а ў чэмпіянаце трапіла ў зацяжную нічыйную паласу, не ўсе гульцы былі ў найлепшым фізічным і псіхалагічным стане. Але Капскі працягваў трымацца абранага курсу, яго ліміт даверу да маладога трэнера быў амаль невычэрпны. І ўжо бліжэй да лета з'явіліся вынікі.

Упершыню пра Лігу чэмпіёнаў мы сталі марыць пасля гасцявой перамогі ў Бруселі над «Андэрлехтам», якую прынёс учорашні дублёр Павел Няхайчык. Дарэчы, сапраўднае адкрыццё Ганчарэнкі: «Убачыў хлопца на першым занятку ў дублі. Тады ў зале трэніравалася чалавек сорак. За вонкавай няскладнасцю адразу прыглянулася футбольная інтэлігентнасць — у неардынарнасці задумак, вострых перадачах, разуменні гульні. Не ўсе падзялялі маю веру ў гэтага гульца. У дублі нават крыўдзіліся, калі я пастаянна ставіў Няхайчыка ў склад. Мне здаецца, што Крывушэнка ў яго так і не паверыў. А я ўсё адно не сумняваўся, што Паша загуляе». Цяпер Няхайчык адзін з галоўных прэтэндэнтаў сярод футбалістаў БАТЭ на салідны кантракт у замежным клубе.

Давер Ганчарэнкі да футбалістаў быў бязмежны. Успамінаецца хатні матч з балгарскім «Леўскім». Пасля першага тайму на табло гарэў слізкі для нас лік

## Давер Ганчарэнкі да футбалістаў бязмежны.

1:1. На варотах стаяў юнак Гутар, а з поля быў выдалены бамбардзір Блізнюк. І якое ж было здзіўленне, калі Ганчарэнка па звычцы выйшаў на другі тайм хвілін за сем да яго пачатку, пакінуўшы футбалістаў адных у распранальні. Тонкі псіхолаг Ганчарэнка свядома ішоў на гэты крок. Навошта накачваць гульцоў непатрэбнымі словамі, калі яны самі цудоўна ведаюць, што ад іх патрабуецца і чаго яны могуць дасягнуць.

А потым быў групавы этап Лігі чэмпіёнаў, дзе БАТЭ даводзілася прадзірацца праз іронію, скепсіс і фанабэрыю многіх футбольных спецыялістаў. Чаго можна было чакаць ад каманды, гадавы бюджэт якой складае адну шостую частку трансферу адзінага футбаліста «Зеніту»?

БАТЭ ж даказаў, што ў футбол гуляюць не грошы і не імёны. Праз гэтую нашу шчырасць і несапсаванасць за БАТЭ і перажывалі не толькі ў Беларусі, але і па ўсім свеце. Для гэтага варта зірнуць на геаграфію каментатараў блогу Ганчарэнкі.

Урэшце, каманда змагла двойчы сыграць унічыю з грозным «Ювентусам», адабраць пункт у «Зеніту», а таксама не прайграць з буйным лікам «Рэалу».

Гэтая восень яшчэ надоўга запомніцца нам даўжэзнымі чэргамі і начоўкамі ля касаў у Мінску і Барысаве, прапановай шалёных грошай за «лішні білецік на БАТЭ», голам Сяргея Крыўца ў вароты «Ювентусу», сейвамі Сяргея Верамка, самаахвярнасцю Уладзіміра Ржэўскага, камандай, якую палюбіла ўся краіна. Гэтая восень запомніцца нам нараджэннем новай футбольнай легенды. Нават калі праз нейкі час атрымаецца паўтарыць такі поспех, першы ўсё адно не забываецца.

Ганчарэнка ж нават у гэтыя гарачыя дні не забываўся пра чалавечае. Пасля піцерскай нічыёй з «Зенітам» ён пакінуў у блогу наступны запіс пра сына і жонку: «Напэўна, і праз шмат сезонаў наша першая Ліга чэмпіёнаў будзе ўспамінацца перадусім тым, як моцна гэтай восенню я сумую па Арцёму. І па Маргарыце...»

**Зміцер Панкавец**

**Найлепшы спартовец году па версіі «Спартыўнай панарамы»**

1. Андрэй Арамнаў (цяжкая атлетыка)
2. Вольга Мянькова (кіданне молату)
3. Андрэй і Аляксандр Багдановічы (веславанне на байдарках і каноэ)
4. Андрэй Краўчанка (дзесяцібор'е)
5. Андрэй Рыбакоў (цяжкая атлетыка)
6. Іна Жукава (мастацкая гімнастыка)
7. Наталля Міхневіч (штурханне ядра)
8. Вадзім Махнеў і Раман Петрушэнка (веславанне на байдарках і каноэ)
9. Кацярына Карстэн (акадэмічнае веславанне)
10. Васіль Кірыенка (велатрэк)

**Найлепшыя беларускія футбалісты году паводле апытання газеты «Прессбол»**

1. Аляксандр Глеб («Барселона», Іспанія)
2. Віталь Радзівонаў (БАТЭ, Барысаў)
3. Аляксандр Кульчы («Растоў», Расія)
4. Сяргей Верамко (БАТЭ, Барысаў)
5. Генадзь Блізнюк (БАТЭ, Барысаў)
6. Сяргей Гурэнка («Лакаматыў», Масква)
7. Юры Жаўноў («Масква», Расея)
8. Сяргей Сасноўскі (БАТЭ, Барысаў)
9. Дзмітры Ліхтаровіч (БАТЭ, Барысаў)
10. Уладзімір Карыцька («Чарнаморац», Адэса)

**Найлепшыя футбалісты свету паводле France Football**

1. Крыштыяну Раналду (Партугалія / «Манчэстэр Юнайтэд», Англія)
2. Ліянэль Месі (Аргентына / «Барселона», Іспанія)
3. Фернанда Торэс (Іспанія / «Ліверпуль», Англія)
4. Ікер Касільяс (Іспанія / «Рэал» (Мадрыд), Іспанія)
5. Хаві (Іспанія / «Барселона», Іспанія)
6. Андрэй Аршавін (Расея / «Зеніт», Расея)
7. Давід Вілья (Іспанія / «Валенсія», Іспанія)
8. Кака (Бразілія / «Мілан», Італія)
9. Златан Ібрагімавіч (Швецыя / «Інтэр», Італія)
10. Стывен Джэрард (Англія / «Ліверпуль», Англія)

## ЗДЫМКІ ГОДУ



БАТЭ: зорны час.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Год «Ляпісаў»

Рокеры вяртаюць былыя пазіцыі, папсавікі пераарыентоўваюцца на Захад — музычныя вынікі году ад **Сяргея Будкіна**.



MITROFANOVA-M.LIVEJOURNAL.COM

У 2008 годзе шмат чаго ў беларускай музыцы адбылося ўпершыню. Вайцюшкевіч паехаў на гастролі ў Японію, ва ўкраінскім Львове прайшоў беларускі рок-фестываль, беларускі ды-джэй увайшоў у тузін найлепшых у свеце, гурт сярэднявечнай музыкі «Стары Ольса» першы раз выступіў у Маскве, і з аншлагам, а на песні беларускіх музыкаў знялі столькі кліпаў, колькі не было за ўсю ранейшую гісторыю... І ўсё ж год прайшоў пад знакам «Ляпісаў» — іхніх канцэртаў, іхніх песень ды іхніх кліпаў.

## Песня, альбом, канцэрт, кліп году

«Які яшчэ жэст добрай волі патрэбны, каб нас прызнала беларуская рок-тусоўка?», — кінуў Сяргей Міхалок **(на фота)** у інтэрв'ю на музычным інтэрнэт-сайце «Тузін Гітоў». Відаць, трохі яго заела, што галоўную Рок-Карону прысудзілі гурту Neuro Dubel. Магчыма, тады ў яго і нарадзілася песня Belarus Freedom — рок-гімн, які дароўнівае «Партызанскай» Лявона Вольскага. Праўда, Міхалок не рызыкнуў яе сыграць ні на сольным канцэрце ў мінскім Палацы спорту, ні ў віцебскім амфітэатры. Новы альбом «Маніфест» гурт вырашыў распаўсюдзіць бясплатна праз інтэрнэт, а потым ужо выдаць на дысках (гэтак жа зрабіў з сваім сольнікам «Куплеты і прыпевы» Лявон Вольскі). «Маніфест» уражвае. Роўных «Ляпісам», прынамсі па тэхніцы і падачы, у Беларусі няма і блізка. А пасля таго, як услед за «Капіталам» Аляксей Церахаў зрабіў кліп на песню Міхалка «Огонькі», стала ясна, што «Ляпісам» няма роўных і тут — гэтая праца атрымала галоўны прыз у намінацыі «Найлепшая анімацыя» на фэсце музычнага відэа VIMUS у Партугаліі, апярэдзіўшы кліпы The Chemical Brothers і Bjork. Відэашэраг прыйшоўся даспадобы і расійскім камуністам, якія, не спытаўшы дазволу, скарысталі яго ў прапагандысцкім ролiку для сайту партыі Зюганава, чым выклікалі справядлівы аўтарскі гнеў.

Масавай вытворчасцю кліпаў для беларускіх выканаўцаў сёлета адзначыўся незалежны тэлеканал «Белсат». За год іх было зроблена некалькі дзесяткаў. Некаторыя з іх нават паказвалі на плазмавых экранах у мінскім метро. Па БТ, праўда, яшчэ не.

## Забароны знялі, боязь засталася

2008 год запомніцца «Рок-Каранацыяй» з бліскучай прамовай Уладзімера Арлова пры ўручэнні Кароны Кулінковічу. Канцэртам «Салідарныя з Беларуссю» ў цэнтры Варшавы, адраджэннем фэсту «Рок па вакацыях», стартам праекту «Рок-школа» для малодых музыкаў і музычнай містэрыяй «Дзень Максіма Багдановіча». Эх, зрабіць бы яе яшчэ больш зразумелай для масаў — ламіліся бы палацы ад гледачоў...

Сёлета на транспамежных фестывалях Be Free, be2gether, «Басовішча» яшчэ гучала тэза пра «забароненых» музыкаў, але ўжо не так упэўнена. У што ж вылілася «пагадненне з д'яблам», як назвала газета Sueddeutsche Zeitung візіт беларускіх музыкаў у прэзідэнцкую адміністрацыю? Гурты з «чорнага спісу» — N.R.M. і Neuro Dubel, «Тройца» і «Палац» — далі сольныя канцэрты ў адзін дзень, Кулінковіч спакойна пачуваў сябе на он-лайн канферэнцыі «СБ», а Хаменка стаў мільгаць у тэлевізары, што той Ціхановіч. N.R.M., дарэчы, былі адзінымі, хто наважыўся на ўсебеларускі тур пасля зняцця ўсіх умоўных забаронаў. Тое, што ехаць у рэгіёны — небяспечна, пацвердзіў канцэрт гурту Neuro Dubel у Магілёве, адменены праз нізкі продаж квіткоў. «Ды на іх проста забыліся за тыя чатыры гады, што яны не прыязджалі», — тлумачылі магілёўскія рок-энтузіясты.

Але па-за кропкавай лібералізацыяй хапала сёлета і звычайнага. Судзілі арганізатараў канцэрту Lombard у Гродна, а ў Мінску быў сарваны канцэрт, прысвечаны Слуцкаму збройнаму чыну і прэмія беларускага музычнага відэа. Чыноўнікі па-ранейшаму засцерагаюцца беларускага, факт.

## Сыход году: Вашкевіч і Свет

Сёлета як мінімум на два таленавітых музыкі ў Беларусі стала меней. Пайшоў з жыцця Андрэй Вашкевіч — лідэр гурту «Любоў і спорт». Сябры-рокеры арганізавалі душэўны канцэрт памяці і сабралі грошай сям'і. Панёс страту беларускі блюз. Згінуў вялікі талент — Святаслаў Хадановіч, лідэр Svet Boogie Band.

**Дванаццаць найлепшых песень 2008 году**

1. «AntiEMO (Parket)» — гурт «Глюкі» (Магілёў).
2. «Сяння Купала, заўтра Ян» — «Osimira» (Менск).
3. «Загінулым паэтам прысвячаецца» — :B:N: (Бяроза) і Лявон Вольскі.
4. «Не веру табе» — Nevma (Магілёў).
5. «Підарасы» — Neuro Dubel
6. «Восень» — гурт «Рокаш» (Мінск)
7. Чароўны мур — TerminX (Мінск).
8. «Белая птушка» — Таццяна Беланогая.
9. «Калыханка» — «Сьцяна» (Брэст).
10. «Тры янгалы» — «Троіца».
11. «Synu» — ILO & Friends (Беласток)
12. «Зорка Венера» — J:Морс.

**Паводле рэйтынгу сайту «Тузін гітоў»**

## Скандал году: Пол і Паліна

Спявачка Паліна Смолава зганьбілася перад усім светам пасля спробы зрабіць немудрагелісты, але эфектны піяр-ход: маўляў, яна мае заспяваць з легендарным Полам Макартні (сумеснае фота прыкладалася). Сорам узяў, калі высветлілася, што тое фота — падробка, а прадстаўнік сэра Пола заявіў, што такога не было і быць не магло. Ён нават не казаў пра існаванне гэтага фота экс-«Бітлу» — бярог яго нервы. Гэтая гісторыя таксама дае падставы для аптымізму: у нашых папсавікоў адбылася пераарыентацыя. Цяперака зусім не модна сябраваць з Кіркоравым ці выдаваць альбомы на фірме «Союз». Гульцы на полі беларускага шоу-бізу пачалі глядзець на Захад. Дарафеева хвалілася на сваім сайце, што выступіць з Джэксанам і Тымберлейкам (праўда, не напісала, што тое двайнікі). Прадзюсер Уладзімір Максімкаў распаўсюдзіў сваю фотасесію, зробленую для нямецкага эратычнага часопіса (праўда, такога не існуе ў прыродзе). Саладуха вунь дзеля зборнага канцэрту нашых эстраднікаў у Варшаве вырашыў перакласці сваю «Чужую мілую» (праўда, на польскую). Заварушыліся. І гэта не так ужо і кепска.

Былі сёлета і сапраўдныя прарывы на Захад. Віцебскі DJ 33, ён жа Валер Шwындзікаў, завецца цяперака ды-джэем №11 у свеце. Гэты статус ён атрымаў на DMC World DJ Championship — мерапрыемстве сусветнага маштабу з больш чым дваццацігадовай гісторыяй, якое праводзіцца ў велізарным лонданскім клубе Indigo2.

## Праект году

Сёлета выйшла пару цікавых складанак («НезалежныЯ», «Басовішча», «Вольныя песні»), але не такога канцэптуальнага ўзроўню, як праекты ранейшых гадоў — кшталту «Хатыні» ці «Святога вечара». Героямі году сталі беларускія журналісты. У 2008 годзе паўстаў шэраг музычных медыйных праектаў. NETradio і радыё «Рацыя» транслявалі ўжывую самыя цікавыя беларускія канцэрты, а першае дык наогул адкрыла асобны канал «100 працэнтаў беларускай музыкі» з фарматам «неэстрада». Журналіст Зміцер Бескараваўны стварыў вельмі неабходны праект — Experty.by з музычнай аналітыкай, якой раней не ставала. Зміцер Падбярэскі выдаў сваю «Энцыклапедыю беларускай папулярнай музыкі». Галоўным гістарычна-музычным праектам году можна лічыць «Беларускі андэграўнд 1960-70-х». Вядоўца радыё «Юністар» Віктар Сямашка першым узяўся за даследаванне гісторыі беларускага року і апісаў, як у Беларусі з'явіліся першыя электрагітары, ладзіліся першыя канцэрты і разганяліся акцыі хіпі. Сваю даследчую працу ён падмацаваў аповедамі ўдзельнікаў тых падзеяў, архіўнымі запісамі ды фотаздымкамі. Праграма ў дзевяці частках выходзіла на радыё «Юністар» і на «Тузіне Гітоў», а потым нават з'явілася ў продажы. Праўда, толькі ў самвыдатаўскім выглядзе. Дзе вы, выдаўцы?

**Сяргей Будкін**

# Залатая гірлянда для дзяцей Нікарагуа

У апошнім нумары мы штогод друкуем калядныя апавяданні. Гэтым разам мы адкрываем новае літаратурнае імя. **Таццяна Рабушка** нарадзілася ў 1985 у Мінску, скончыла філфак БДУ. Працуе ў сферы гандлю. Першую літаратурную славу заслужыла сваім інтэрнэт–дзённікам lionellia.livejournal.com.

Кожны раз, калі мяне запытваюць, якое маё запаветнае жаданне, я адчуваю негатыўныя імпульсы, што сыходзяць ад майго сумлення. Маўляў, ну як гэта так, чаму ты просіш усё толькі сабе і сабе, трэба ж думаць пра глабальнае. Пра мір ва ўсім свеце, каб вынайшлі лекі ад усіх хваробаў, каб накармілі нарэшце ўсіх галодных дзяцей у Нікарагуа і гэтак-гэтак далей. Таму кожны раз, калі мяне запытваюць, што табе, Таня, падарыць на Каляды, я з палёгкай думаю пра той факт, што няма сярод маіх сяброў і сваякоў чараўнікоў. Што не змогуць яны здзейсніць глабальных маіх жаданняў, таму з чыстым сумленнем замаўляю што-небудзь з касметыкі, упрыгажэнняў, жартам магу папрасіць наняць стрыптызёра і са скрухай адзначыць, што жартам гэтае і ўспрымаюць.

Так было, ёсць і так будзе. На гэтыя Каляды я замовіла новыя джынсы ў брата, новы раман вядомага нямецкага аўтара ў сяброўкі, новы манітор для камп'ютара ў бацькоў, а таксама добрага жаніха ў лёсу. Спіс падарункаў быў прадуманы, зацверджаны і ўзгоднены.

Увечары я пару гадзін размаўляла па тэлефоне з той самай сяброўкай, якая павінна будзе набыць мне кнігу. Мы абмеркавалі, здаецца, палову праблемаў у гэтым свеце, таму вырашылі на сёння спыніцца і заняцца больш легкадумнымі справамі. Прынамсі я вырашыла папалохаць у асьцы статусам «он-лайн» свайго былога хлопца. Заўжды падымаю сабе настрой, калі бачу, як ён хуценька выбягае з аські, як толькі я туды ўваходжу. Я нават не паспяваю напісаць, што чапаць цябе, дарагі, не збіраюся. Неяк падчас «п'янога тарыфу» я пакінула яму камент, маўляў, карыстайся рэжымам нябачнасці. Але ён намёк не зразумеў і шчыра здзівіўся, пра што гэта я. Мужчыны задужа часта паводзяць сябе як дзеці.

Гэтым разам зноў праз 5 хвілін пасля майго ўваходу «квіп» паведаміў, што terminator07 (і як я магла сустракацца з такім хлопцам?) не ў сеціве. Калі б я добра разбіралася ў наладках, паставіла б на гэтае паведамленне гукавы запіс з фільму «Тэрмінатар», як герой Арнольда гаворыць «айл бі бэк». Было б яшчэ больш прыкольна. Сяджу, размаўляю па асьцы з той сяброўкай, з якой толькі што гаварыла па тэлефоне, як тут раптам да мяне грукаецца нейкі незнаёмы чэл з нікам sv_mikalay. Што за спальны_вагон_мікалай? Зноў, мабыць, нейкі пікапер ці турак. Вось я разумею, калі яны на «аднакласніках» якіх лезуць знаёміцца: там маё прыгожае фота, адрэдагаванае ў фоташопе. А ў асьцы? Мо я ўвогуле пацан, ці такі ж турак. Жэсць проста. Я ігнаравала гэтага карыстальніка недзе каля гадзіны.

А ён усё пісаў і пісаў мне нешта пра тое, што ён нібыта Святы Мікалай, які жыве недзе ў далёкай Лясной Ландыі. Напісаў, што цяпер перад ім ляжыць мой ліст, які яму напісала дзесяцігадовая дзяўчынка акурат столькі гадоў таму, як менавіта мне было дзесяць. Аднак гэтага быць не магло аніяк, бо, па-першае, я была дужа разумным дзіцём і заўжды ведала, што падарункі мне набываюць бацькі. І нават калі я пісала ліст Святому Мікалаю, то пісала я яго, дакладна ўсведамляючы, што насамрэч пішу бацькам. Я з дзяцінства была акторкай. А па-другое, падчас зносін у асьцы з гэтым невядомым мне дасюль карыстальнікам я дакладна адчувала, што гэта жорсткі сцёб з мяне. І як толькі пачала друкаваць недарэчнаму жартаўніку пцёўку ў адмысловы кірунак, ён мне выдаў тэкст ліста той самай дзяўчынкі, пра якую распавядаў.

«Дарагі Святы Мікалай! Мяне завуць Таня, мне 10 гадоў. Роўна столькі гадоў я паводжу сябе добра. У школе я — выдатніца, бацькам пастаянна дапамагаю па гаспадарцы. Сябрую з такімі ж добрымі дзяўчаткамі, як і я. Не крыўджу брата. Насамрэч мне нічога не трэба на гэты Новы год. Я хачу толькі таго, каб ува ўсім свеце ніхто і ніколі не хварэў. Твая ўнучка, Танечка»



Я паглядзела і зразумела, што гэта насамрэч мой ліст. Я як цяпер памятаю той адмысловы прадуманы крок: нічога не прасіць. Ну пагадзіцеся, якія бацькі не набудуць новую класную ляльку дзіцяці, якое толькі і просіць што здароўя ўсім? І тут да мяне дайшло, што гэты чалавек у асьцы, ён не проста чалавек. Гэта сапраўдны Святы Мікалай! Выходзіць, ён усё ж такі існуе! О, майн гад! Няўжо ўсе тыя лісты, што я калісьці пісала як бы яму, насамрэч даходзілі да яго???

«Не можа гэтага быць...» — толькі і здолела надрукаваць я.

«Можа!»

«І ўсе тыя падарункі, што я знаходзіла пад ёлкай, гэта былі не бацькі, а ты???»

«Не, гэта былі насамрэч твае бацькі. Я зараз табе ўсё патлумачу. Ты перамагла ў конкурсе!»

«У якім???»

«Кожны год мы збіраем усе тыя лісты, што да нас прыходзяць ад дзяцей. Збіраем, перавязваем і хаваем у скрыню, каб праз дзесяць гадоў адабраць адзін самы шчыры ліст і ашчаслівіць ягонага аўтара, зрабіць падарунак у дарослым жыцці за дзіцячую шчырасць. Роўна дзесяць гадоў таму гэты твой ліст трапіў у скрыню з надпісам «здзейсніць у 2008-м». Як толькі пачаўся гэты год, мы дасталі скрыню і доўга-доўга чыталі і аналізавалі ўсе лісты, што прыйшлі да нас у 1998-м»

«І мой аказаўся найлепшым?»

«Ну, не зусім. Твой ліст заняў трэцяе месца».

«То бок мне проста дадуць цукерку і прымусяць прачытаць вершык?»

«Не. Гэта значыць, што ў цябе ёсць толькі адно жаданне, якое я магу выканаць».

«А жаданне абсалютна любое можа быць?»

«Абсалютна. Я магу падарыць табе ўсё, што б ты ні папрасіла. Нават тое, што, здавалася б, здзейсніць немагчыма;)»

Я зразумела, што гэта намёк на «мір ва ўсім свеце» і паабяцала роўна праз 24 гадзіны быць у асьцы з усвядомленым адказам на пытанне, што я хачу. Мне стала сорамна за сваё дзяцінства, за той абсалютна няшчыры ліст. Яны там сядзяць, чытаюць гэтыя лісты, абіраюць найлепшыя, каб зрабіць добрым гэты свет. Яны спадзяюцца на тое, што добрыя дзеці станавяцца добрымі дарослымі. А што я? Я ж і дзіцём была не вельмі шчырым...

Вось жывеш так, нікому не перашкаджаеш, а табе такое на галаву падае. Вось і хадзі, адчувай сябе адказнай за ўвесь свет. А я хачу сабе новае футра. І машыну новую хачу. І жаніха хачу. Шмат чаго хачу, але разумею, што варта замовіць нешта глабальнае. Вось трэба ж было так выпендрыцца дзесяць гадоў таму з гэтым лістом... Эх, я...

Цэлы наступны дзень я блукала па вуліцах Мінску і ўяўляла, што ў маёй кішэні ляжыць шмат грошай. Я магу дазволіць сабе абсалютна ўсё, што ёсць вакол: і не толькі матэрыяльнае. Я магу папрасіць, каб усе мужыкі ляжалі ля маіх ног. Ці каб усё найлепшае адзенне свету было ў маім гардэробе. Рысы твару змяніць, грудзі, нарэшце, пятага памеру ды без сілікону, а дзякуючы добраму Святому Мікалаю. Эх, як жа цяжка абраць нешта адно ды каб яшчэ і апраўдаць давер. Ці стане свету лягчэй ад майго ўласнага шчасця? Ніхто і не заўважыць. А вось калі раптам знікнуць няшчасці ці яшчэ што... Трэба падумаць, трэба сфармуляваць. Мама дарагая, ну чаму менавіта я? Чаму я павінна ратаваць свет, калі я банальна хачу сабе новыя шмоткі!

Я звярнула з праспекту на ціхую вулачку. І раптам ля мяне прабег бяздомны сабачка. «Як жа яму холадна», — падумала я, прысела ля яго і прамовіла:

— Ну прывет, Кабыздох! Як маешся?

А ён стаіць побач, глядзіць на мяне сваімі гэтымі вочкамі, носік так кранальна дрыжыць. І зразумела я, што нясу за яго адказнасць. Дый не толькі за яго. За ўсіх, хто ў такія маразы вымушаны жыць на вуліцах...

— Ну ладна, ладна! Толькі не глядзі на мяне так! Папрашу, каб не было ў гэтым свеце жывых істот без дому. Каб ва ўсіх была страха над галавой, ежа, цяпло і ўтульнасць. Хай вам усім будзе добра, а я як-небудзь перажыву.

Сабачка з удзячнасцю гаўкнуў і збег. Мне б ягоную бесклапотнасць!..

Абяцанне, дадзенае невядомаму сабаку, трэба было выконваць. Я прыйшла дамоў і зайшла ў аську. Там сядзеў terminator07, які хутка апынуўся па-за сецівам. Мо папрасіць Святога, каб ён адключыў гэтаму чудзіку функцыю выхаду з аські? Во прыкол быў бы. Сабачкі і так бы адагрэліся, а хлопец рэальна б напужаўся. Не, нельга так, Таня. Толькі глабальнае.

Са мной павіталася сяброўка, і мы пачалі абмяркоўваць сённяшняе маё наведванне аднаго крутога магазінчыка каштоўных упрыгажэнняў.

«І чаго цябе туды занесла?» — запыталася яна.

Мне падалося, што аповед пра абяцанне Святога Мікалая выканаць любое маё жаданне падаўся б абсурдным, таму аджартавалася:

«А раптам да мяне прыедзе алігарх і скажа: хачу зрабіць табе, Танька, падарунак. А я буду падрыхтаванай, маўляў, вось той пярсцёнак вось у тым магазіне хачу».

«Крутая ты».

«А то!»

«Дык што ты там нагледзела?»

Тут у аську зайшоў sv_mikalay. Мы павіталіся. На гэты раз ён быў вельмі сур'ёзным, адразу запытаў, ці вызначылася з падарункам. Я адказала станоўча. Пасля гэтага ён сказаў, што трэба запоўніць нейкі пратакол, што мяне дужа здзівіла: няўжо і там такая бюракратыя? Пакуль ён там нешта запаўняў сабе, я працягнула размову з сяброўкай пра тое, што бачыла ў тым ювелірным буціку. І як яна можа запытваць пра гэтыя розныя неістотныя ў жыцці дробязі, калі вось я зараз вырашаю такое важнае для Зямлі пытанне! Уявіце, ужо заўтра на вуліцах не будзе бяздомных істот!!! Задумалася пра сваё прызначэнне ў гэтым свеце, адчула сябе сапраўднай маці Тэрэзай і ўжо нават у думках не дапушчала, як можна замовіць сабе нейкую дробязь, нейкую касметыку ці яшчэ што.

«А вось сур'ёзна, як там цэны? Вось ты са сваім заробкам, што б змагла набыць там?» — прыйшло паведамленне ад сяброўкі.

Вось ужо гэтая Алена, грошы ўсё яе цікавяць, грошы... Эх ты. Я не магла ўтрымліваць эмоцыі ў сабе. Я пачала хадзіць па пакоі, актыўна махаць рукамі і гаварыць самой сабе:

— Як людзі могуць быць такімі!!! Свет змяніць так проста! Дастаткова ўсім падумаць пра глабальнае!

Села за комп і напісала сяброўцы, каб толькі адмазацца ад яе, такой вось абмежаванай:

«Кавалак гірлянды пад золата. І адчапіся ад мяне».

Націскаю Enter і з жахам заўважаю, што адказала не на пытанне сяброўкі, а на словы Святога Мікалая: «Пратакол састаўлены. Засталося ўнесці тваё жаданне. Такім чынам, што ты сабе хочаш?»

Жыццё было скончана. Я не паспела ўсвядоміць, што адправіла паведамленне не ў тое акно — і ён ужо быў офлайн, як і terminator07. Але мой былы сябар заўтра абавязкова вернецца, а вось Святы Мікалай...

На наступны дзень маленькі эльф прынёс мне кавалак гірлянды, акурат такі, які вісеў у ювелірным салоне. Пад золата. Паглядзеў на мяне сумнымі вачыма і сышоў. Я не здолела анічога ў яго спытаць, бо прачытала ў ягоным позірку: «А мы так на цябе разлічвалі».

Прыйшла ў свой пакой, уключыла канал «Энімал плэнет» і, трымаючы ў руцэ залатую гірлянду, доўга глядзела перадачу, дзе людзі ратуюць бяздомных жывёл.

Сумленне супакойвала толькі адна думка: мой ліст заняў толькі трэцяе месца. Гэта значыць, што ёсць яшчэ людзі і ёсць яшчэ жаданні. У глабальных праблем ёсць яшчэ шанец знікнуць.

А сабакі ўсё такія ж бяздомныя, людзі — хворыя, а дзеці Нікарагуа — галодныя.

Каб вызначыць найлепшую кнігу году, мы звярнуліся да дванаццаці экспертаў: кнігагандляроў, крытыкаў, навукоўцаў, выдаўцоў. У выніку найлепшай была прызнаная анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX ст. «Галасы з–за небакраю». Уклаў яе **Міхась Скобла**.

# Найлепшыя кнігі 2008




Літаратуры за год выйшла так шмат, што амаль ніхто з экспертаў не ўспомніў кніг, якія пабачылі свет у першай палове 2008: выдатную «Цацачную краму» Леаніда Дранько-Майсюка, паэтычны зборнік «Дзевяностыя forever» Сяргея Прылуцкага і кнігу вершаў Пятра Васючэнкі «Піраміда Лінея». З іншага боку, безумоўна вартыя, але выдадзеныя ў лістападзе—студзені «Мой шыбалет» Пятра Садоўскага, «Люблю Беларусь» Паўла Севярынца і іранічна-хуліганскі «Сабака» Юрася Пацюпы, проста не ўправіліся трапіць на чытацкае вока.

Стуль выспявае парада: хто хоча трапіць у шорт-лісты, мусіць выдавацца пры канцы лета — на пачатку восені. І пажадана, у недзяржаўных выдавецтвах.

Напрыклад, у нядаўна створаным выдавецтве «Галіяфы», што цягам году здзейсніла шэраг удалых праектаў, або ў «Лімарыусе», што на радасць аматарам тутэйшага працягваў сваю ціхую экспансію. Ці ў па-ранейшаму непахіснага «Логвінава». Дарэчы, другі год запар «Логвінаў» — выдавецтва году, хіба што сёлета вымушана падзяліць першынство з гродзенска-вроцлаўскім выдавецкім праектам.

Дзяржаўныя выдавецтвы? Яны, здаецца, настала адмовіліся адкрываць новыя імёны ды ўвогуле ўплываць на сучасны літаратурны працэс. Не хацелася б, але ўжо, пэўна, вымалёўваецца ніша для дзяржаўных выдавецтваў — хлебнае, але нейкае такое бязвольнае перавыдаванне беларускай класікі і выпуск календароў ды даведачнай літаратуры.

У спісах найлепшых кніг як няма леташняга разнабою, дык заўважаецца прынамсі доўгачаканая разнастайнасць жанраў. У спісах экспертамі незабытыя — паэзія (зборнікі Галіны Дубянецкай, Валянціны Аксак, Андрэя Хадановіча і Рыгора Барадуліна), дзіцячая літаратура — шведская дзяўчынка Піпі разам з вадзянікамі і дамавікамі з энцыклапедыі «Чароўны свет» глядзяцца побач з дарослымі кнігамі як найменей дарэчы. Як заўсёды багата прэзентавана эсэістыка (Данута Бічэль).

У спісы цалкам заслужана ўвайшоў таксама плён шматгадовае працы Юр'я Гардзеева — «Магдэбургская Гародня». Лішне вытлумачваць папулярнасць кніг, прысвечаных Васілю Быкаву.

Такім чынам... спярша хіба варта ўзгадаць кнігі, якія перамаглі ў кніжных рэйтынгах у мінулыя гады:

2005 — Генюш Ларыса. Каб вы ведалі: з эпісталярнай спадчыны (1945—1983) — Лімарыус.

2006 — Юры Туронак. Мадэрная гісторыя Беларусі: збор твораў — Інстытут беларусістыкі / ARCHE.

2007 — Павал Севярынец. Лісты зь лесу. — Інстытут беларусістыкі / Кнігарня «Наша Ніва».

Выніковы спіс падаецца паводле падліку балаў па дзесяцібальнай сістэме. За кожнае першае месца ў спісе налічваецца 10 балаў, за другое — 9 і гэтак далей.

**Сёлетняя дзесятка найлепшых кніг 2008 году выглядае так:**

**1.** Галасы з–за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX ст. Укладаў Міхась Скобла. — Мінск: Лімарыус — **41 бал**.

**2.** Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі: збор твораў. Укл., прадмова і каментар Алеся Пашкевіча і Андрэя Вашкевіча. — Вільня: Інстытут беларусістыкі / ARCHE. — **35 балаў**.

**3.** Юры Гардзееў. Магдэбургская Гародня. Сацыяльная тапаграфія і маёмасныя адносіны ў XVI—XVIII ст. — Гродна–Вроцлаў. (серыя «Гарадзенская бібліятэка»). — **30 балаў**.

**4.** Дажыць да зялёнай травы…: ліставанне і аўтографы Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна (1960—2003). — Львоў: ВолЯ — **27 балаў**.

**5.** Аляксей Карпюк. Развітанне з ілюзіямі. — Гродна–Вроцлаў. (серыя «Гарадзенская бібліятэка»). — **24 балы**.

**6.** Андрэй Хадановіч. Бэрлібры: гісторыя ў чатырох фільмах. — Мінск: Логвінаў / Кнігарня «Наша Ніва». — **22 балы**.

**7.** Данута Бічэль. Хадзі на мой голас. — Гродна–Ўроцлаў. (серыя «Гарадзенская бібліятэка»). — **20 балаў**.

**8-9.** Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца: Раман. — Мінск: Логвінаў / Кнігарня «Наша Ніва», Андрэй Унучак. «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906—1915). — Мінск: Беларуская навука — па **18 балаў**.

**10.** Галіна Дубянецкая. Анадыямена: вершы. — Мінск: Медысонт (серыя «Бібліятэка Дзеяслова»). — **17 балаў**.

Толькі на адзін пункт адстаў Барыс Пятровіч з кнігай «Жыць не страшна. Фрэскі». — Мінск: Медысонт. — **16 балаў**.

Тры разы ў спісе ўзгадваюцца яшчэ кнігі Сяргея Харэўскага «Пра–моўленае» і Пётры Садоўскага «Мой шыбалет».

**Спісы, найлепшых кніг, складзеныя экспертамі:**

**Кнігарня «Акадэмкніга»** (дырэктарка Соф'я Жыбулеўская), Мінск:
1. Колас Я. Збор твораў у 20 тамах. Том 4,5. — Мінск: Беларуская навука.
2. Кулагін А.М. Каталіцкія храмы Беларусі. —Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П.Броўкі.
3. Родны край. Адрыўны каляндар на 2009 год. — Мінск: Беларусь.
4. Ліхадзедаў Ш.А. Мінск: падарожжа ў часе. — Мінск: Тэхналогія.
5. Галасы з–за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX ст.
6. Рыгор Барадулін. Выбраныя творы. —Мінск: Кнігазбор.
7.Уладзімір Караткевіч. Дзікае паляванне караля Стаха. Аповесць. — Мінск: Мастацкая літаратура.
8.Дзяніс Раманюк. Мой шлях Беларусь: Фотаальбом. — Мінск: Рыфтур.
9. Лявон Баршчэўскі. Еўраслоўнік. —Мінск: Радыёла–Плюс.
10. Цітоў А.К. Геральдыка Беларусі. Слоўнік–даведнік. — Мінск: МФКД.

**Алесь Мазанік**, гандляр кнігамі, «Кніжны кірмаш»:
1. Дажыць да зялёнай травы…: ліставанне і аўтографы Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна (1960—2003).
2. Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца.
3. Бохан, Ю. Турнірныя традыцыі ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVI стст. — Мінск: Логвінаў.
4. Андрэй Хадановіч. Бэрлібры: гісторыя ў чатырох фільмах..
5. Галіна Дубянецкая. Анадыямена.
6. Аляксей Талстоў. Бег. Раман. — Мінск: Галіяфы.
7. Сяргей Законнікаў. Дол. — Мінск: Галіяфы.
8.Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі..
9. Адам Мальдзіс. — Мінск: Беларускі кнігазбор.
10. Сяргей Харэўскі. Пра–моўленае. — Вільня: Выдавецтва Эўрапейскага гуманітарнага універсітэту.

**Выстава на сядзібе БНФ:**
1. Кастусь Акула. Заўтра ёсць учора. Пер. з анг., прадм. Ірыны Верабей. — Мінск: Медысонт (серыя «Бібліятэка Бацькаўшчыны», 15 том).
2. Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца.
3. Пётр Краўчанка. Беларусь на ростанях: Нататкі дыпламата і палітыка. — Вільня: Інстытут беларусістыкі / Кнігарня «Наша Ніва».
4. Астрыд Ліндгрэн. Піпі Доўгая панчоха. Пер. са шведскае Дзмітры Плакс. — Мінск: Зміцер Колас.
5. Уладзімір Арлоў. Імёны свабоды. — Радыё «Свабодная Еўропа» / Радыё «Свабода» (серыя «Бібліятэка Свабоды»).

**Міхась Скобла**, аглядальнік радыё «Свабода»:
1. Данута Бічэль. Хадзі на мой голас.
2. Дажыць да зялёнай травы…: ліставанне Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна (1960—2003).
3. Барыс Пятровіч. Жыць не страшна. Фрэскі. — Мінск: Медысонт.
4. Аляксей Карпюк. Развітанне з ілюзіямі. — Гродна–Вроцлаў.
5. Расстраляная літаратура: творы беларускіх пісьменнікаў, загубленых карнымі органамі бальшавіцкай улады. Укл. Кастуся Цвіркі, Лідзіі Савік. — Мінск: Кнігазбор.
6. Павал Севярынец. Люблю Беларусь. — Вільня: Інстытут беларусістыкі / Кнігарня «Наша Ніва».
7. Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі.
8. Класіка: Вінцэнт Дунін–Марцінкевіч. Пінская шляхта; Кастусь Вераніцын. Тарас на Парнасе. Укл. Язэп Янушкевіч. — Мінск: Віктар Хурсік.
9. Віктар Карамазаў. Краса і воля: кніга пра Станіслава Жукоўскага. — Мінск: Медыял.
10. Пётра Садоўскі. Мой шыбалет. — Радыё «Свабодная Еўропа» / Радыё «Свабода» (серыя «Бібліятэка Свабоды»).
11. Франц Сіўко. Дзень бубна. — Мінск: Логвінаў / Кнігарня «Наша Ніва».

**Людміла Рублеўская,** аглядальніца газеты «Беларусь сегодня»:
1. Галасы з–за небакраю.
2. Віктар Шніп. Страла кахання, любові крыж. — Мінск: Мастацкая літаратура.
3. Барыс Пятровіч. Жыць не страшна: фрэскі .
4. Альгерд Бахарэвіч. Праклятыя госці сталіцы. Раман. — Мінск: Логвінаў.
5. Андрэй Хадановіч. Бэрлібры.
6. Юры Станкевіч. Мільярд удараў. Аповесці, апавяданні, казкі. — Мінск: Галіяфы.
7. Віка Трэнас. Экзістэнцыйны пейзаж. — Мінск: Галіяфы.
8. Аксана Спрынчан. ЖываЯ. — Мінск: Мастацкая літаратура.
9. Галіна Дубянецкая. Анадыямена.
10. Таццяна Сапач. Няхай не пакіне нас восень. — Мінск: Медысонт (серыя «Бібліятэка Дзеяслова»).

**Генадзь Сагановіч**, гісторык:
1. Юры Гардзееў. Магдэбургская Гародня. Сацыяльная тапаграфія і маёмасныя адносіны ў XVI—XVIII ст.
2. Homo Historicus 2008. Гадавік антрапалагічнай гісторыі / пад рэд. А.Смаленчука з удзелам І.Дубянецкай. — Вільня: ЕГУ.
3. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. — Мінск: Экаперспектыва.
4. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 30 (1480—1546) / Кніга запісаў №30. Падрыхтаваў В.Мянжынскі. — Мінск: Беларуская навука.
5. Макараў, Максім. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча местаў Беларускага Падзвіння ў XIV — першай палове XVII ст. — Мінск: Экаперспектыва.
6. Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання ВКЛ і Рэчы Паспалітай у XV—XVIII ст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Нав. рэдактары С. Сокал і А. Янушкевіч. — Мінск.
7. Андрэй Унучак. «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906—1915).
8. Юры Бохан. Вайсковая справа ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XIV — канцы XVI ст. — Мінск: Беларуская навука.
9. Новікаў, Ягор. Ваенная гісторыя беларускіх земляў да канца XII ст. Т. 2. — Мінск: Логвінаў.
10. Бароўскі, Барыс. Ураджэнцы Беларусі ў арміі Андэрса падчас Другой сусветнай вайны. — Мінск: Віктар Хурсік.

**Анатоль Сідарэвіч**, гісторык, літаратуразнавец:
1. Галасы з–за небакраю.
2. Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі;
Адам Станкевіч. Выбранае. Укл. Уладзіміра Конана. — Мінск: Кнігазбор.
3. Аляксей Карпюк. Развітанне з ілюзіямі.
4. Расстраляная літаратура.
5. Андрэй Унучак. «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906—1915).
6. Цітоў А.К. Геральдыка Беларусі. Слоўнік–даведнік. — Мінск: МФКД.
7. Юры Бохан. Вайсковая справа ў Вялікім Княстве Літоўскім…
8. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага.
9. Пётра Садоўскі. Мой шыбалет.
10. Вильна 1823—1824: Перекрестки памяти (Иоахим Лелевель. Новосильцов в Вильне; Иван Лобойко. Мои воспоминания). (укл., Фядута А. Лімарыюс, 2008)

**Аляксандра Дынько**, галоўная рэдактарка выдавецтва «Логвінаў»:
1. Івонка Сурвілла. Дарога. Стоўпцы—Капенгаген—Парыж—Мадрыд—Атава. — Мінск: радыё «Свабода».
2. Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі.
3. Астрыд Ліндгрэн. Піпі Доўгая панчоха.
4. Ідыш–беларускі слоўнік. Укладаньне Алеся Астравуха. — Мінск: Медысонт.
5. Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы. — Мінск: Логвінаў / Кнігарня «Наша Ніва».
6. Галасы з–за небакраю.
7. Вера Бурлак, Віктар Жыбуль. Забі ў сабе Сакрата. Вершы. — Мінск: Галіяфы.
8. Чароўны свет. З беларускіх міфаў, паданняў і казак. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя.
9. Данута Бічэль. Хадзі на мой голас.
10. Валянціна Аксак. Ружоўніца. — Мінск: Логвінаў.
11. Вильна 1823–1824: Перекрестки памяти .

**Аляксандр Фядута**, палітычны кансультант, выдавец:
1. Галасы з–за небакраю.
2. Таццяна Сапач. Няхай не пакіне нас восень.
3. Галіна Дубянецкая. Анадыямена.
4. Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі.

**Марыйка Мартысевіч**, літаратарка:
1. Міхал Анемпадыстаў, Лявон Вольскі. Народны Альбом. — Мінск: Медысонт, 2008.
2. Андрэй Хадановіч. Бэрлібры.
3. Чала я не хіліў прад сілай. Анталогія беларускай паэзіі XV–XX стагоддзяў. Укл. Лявон Баршчэўскі і Адам Паморскі. Вроцлаў: «Калегіум Усходняй Еўропы».
4. Пётра Садоўскі. Мой шыбалет.
5. Альгерд Бахарэвіч. Сарока на шыбеніцы. — Мінск: Логвінаў.
6. Павал Касцюкевіч. Душпастарскія спатканні для дачнікаў. — Мінск, Логвінаў / Кнігарня «Наша Ніва».
7. Сяргей Прылуцкі. Дзевяностыя forever. — Мінск: Медысонт. (Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў»).
8. Сяргей Харэўскі. Пра–моўленае. — Вільня: Выдавецтва ЕГУ.
9. Уладар Пярсцёнкаў. Пер. з анг. Дз. Магілеўцава і К. Курчанковай. — Мінск.
10. Галіна Дубянецкая. Анадыямена.

**Чарнякевіч Андрэй**, гісторык, педагог:
1. Юры Гардзееў. Магдэбургская Гародня…
2.Казлоўскі, М. Нашчадак слаўны крывічоў. Пра Адольфа Клімовіча. — Мінск: Кнігазбор.
3. Данута Бічэль. Хадзі на мой голас.
4. Павал Сяўрук. Небыцця не існуе. — Гродна–Вроцлаў. (серыя «Гарадзенская бібліятэка»).
5. Адам Станкевіч. З Богам да Беларусі.
6. Андрэй Унучак. «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906—1915).
7. Романько, О. Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941—1945. — Москва: Вече.

**Андрэй Вашкевіч**, гісторык:
1. Юры Гардзееў. Магдэбургская Гародня…
2. Аляксей Карпюк. Развітанне з ілюзіямі.
3. Дажыць да зялёнай травы…: ліставанне і аўтографы Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна (1960—2003).
4. Казлоўскі, М. Нашчадак слаўны крывічоў. Пра Адольфа Клімовіча. — Мінск: Кнігазбор.
5. Сяргей Харэўскі. Пра–моўленае.
6. Гісторыя Беларусі, II–і том.
7. Сяргей Харэўскі. Культавае дойлідства Заходняй Беларусі ў 1920—30 гады. — Вільня: Выдавецтва ЕГУ.
8. Андрэй Унучак. «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906—1915).

## Зміцер Вайцюшкевіч



Тое, што трэба, West Records, 2008

**Элвіс ён, фолк-мадэрніст, хуліган багемны або пяюн для тых, хто трохі ў гадах?**

Вайцюшкевіч склаў пакручастую праграму з уласцівымі толькі яму выкрунтасамі, назбіраўшы на дыск песні яшчэ з больш далёкай шуфляды, разбавіў тое каверамі, напісанымі з розных нагод і пры розных абставінах ды дабіў тым, што засталося ад «Танга з ружай» і «Баладаў». У выканаўцы з'явілася яшчэ больш правоў на тое, каб звацца голасам беларускай багемы, хоць бы таму, што ён перапявае Кулінковіча па-французску, а Louise Attaqie ды Жака Брэля па-беларуску. А яшчэ ж ёсць патрыётыка («Сцяг»), песенькі недзе з гумаркам («Мірныя людзі» і «Чувіха» аўтарства Барадуліна з Бураўкіным) ды досыць нечаканы фолк-блок (а то праўда, ужо пачалі забывацца, з чаго ўсё пачыналася). Усё, што трэба, ёсць. Па традыцыі ўжо, як і на кожным дыску Вайцюшкевіча, ёсць і парачка прахадных кампазіцыяў, заваленых, як з гледзішча аранжыроўкі, так і выканання. Такія песні даволі проста вылічыць, бо ў іх выканаўца пачынае перайграваць самога сябе. Тут вядзецца пра «На завулку гнойным», зусім не калібру «Народнага альбому». І такія песніпрамовы на аматара («Калісьці і дзесьці», «Мірныя людзі»). Выйшаў у Вайцюшкевіча негармонічны, але прывабны дыск. Каб яшчэ пра гармонічнасць можна было казаць, выканаўцу трэба вызначыцца: Элвіс ён, фолк-мадэрніст, хуліган багемны або пяюн для тых, хто трохі ў гадах? А то ад такой колькасці розных Вайцюшкевічаў галава кругам ідзе.

## Tlusta Lusta




Блін першы, БМА-груп, 2008

**Цётчына «Вера беларуса» пераўтварылася ў безгаловы панк-адцяг.**

Панк-містыфікатары з Гродна — трэскі, што выплылі на хвалях «Басовішча». Падавалася, што пасля Devation і «Кальяну» Гродна ўжо не здольнае даць краіне вугля. «Тлуста луста» — не такія зубатыя, але даць чаду здольныя не меншага. Той брутальны раскілбас, што ў «Тлусты лусты» песняю завецца, можа выклікаць дзве рэакцыі — альбо ваніты, альбо... замілаванне. На сваім першым альбоме музыкі ў асноўным дэманструюць цуды інтэрпрэтацыі (з 10 песень толькі з палову аўтарскіх з улікам інструменталу). Цётчын твор «Вера беларуса» пераўтварыўся ў абсалютна безгаловы панк-адцяг «Рамалэ» — яшчэ б духавую секцыю, і Кустурыца ездзіў бы ў Гродна па запалкі. Нацыянальна-патрыятычная лірыка Купалы («Мне сняцца сны аб Беларусі») таксама набыла нечаканае ўвасабленне (літаратуразнаўцам слухаць непажадана!), а хіт Вясны-2006 «Колер маёй рэвалюцыі» музыкі паскорылі ў тэмпе да такой ступені, што вакаліст не паспявае спяваць за інструментамі. А ёсць жа яшчэ прыкольны кавер на МакSim і на тых жа Devation. Музыкі выкарыстоўваюць цікавыя музычныя хады, кідаючы то ў жар, то ў холад (песенькі «Ванілін», «Супраціў»). Адчуваецца недадуманасць канцэпцыі з уліку кавер-скіраванасці гурту і невялікай колькасці свайго матэрыялу. Ды яшчэ шкада, што на іх канцэртах словаў не расчуць.

## Сябры




Песні Ігара Лучанка ў выкананьні ансамблю «Сябры», Вігма, 2008

**То пра Крывіцкую Пагоню, то пра савецкія будатрады.**

«Сябры» заўжды былі майстрамі спалучаць неспалучальнае. Хочаце атрымаць найлепшае ўяўленне, як можна супярэчыць сабе самому цягам больш чым трыццаці гадоў — трэ слухаць гэты дыск. Тут сабраныя настолькі розныя песні, што вы раз і назаўжды пазбавіцеся адназначнага стаўлення да творчасці Анатоля Ярмоленкі, Алесі і Ка (дарэчы, хто-небудзь ведае прозвішча яшчэ хоць аднаго ўдзельніка ансамблю?). «Сябры» пяюць то пра Крывіцкую Пагоню, то пра савецкія будатрады, то апяваюць край словамі Коласа, Цёткі і нават Пазняка (!), а то раптам зацягваюць «если в сердце моём Беларусь, значит, ты в сердце моём, Россия»... І кампазітар-загадка Лучанок дзівіць не менш — абсалютна панурыя і незапамінальныя мелодыі, што забіваюць сваёй прымітыўнасцю тут суседзяць з творамі, да якіх пасуе азначэнне шэдэўр («Авэ, Марыя»). У ранніх песнях «Сяброў» сапраўды адрозненняў ад «Песняроў» трэба шукаць з лупаю («Кася»), але бачна, што пад сярэдзіну 1980-х «Сябры» пазбавіліся ўплываў арт-року і фолку і сталі чыста на эстрадны шлях, выконваючы забаўляльную («Полька беларуская»), ідэалагічную, а то і абслугоўваючую функцыі (брыдзяціна «Россия-Беларусь» і невыдадзеная тут «Слушай батьку»).

## Віктар Пшанічны



Алхімікі, West Records, 2008

**«Электронны мача».**

Слава піяр-службе спевака. Яго прозвішча запомнілася адразу і назаўжды пасля інтэрнэт-рассылкі «Віктар Пшанічны трапіў у аўтааварыю. Фота прыкладаюцца». Ёсць рызыка, што і помніцца ён будзе надалей толькі з гэтай нагоды, бо дэбютнік артыста па праслухоўванні хочацца забыць як найхутчэй. Асабліва тэксты з звышдзікімі вобразамі (кампактныя класцеры, механічныя звяры, магнітныя хвалі). Голас незапамінальны, хоць праскокваюць салтыкоўскія ноткі і нібы нават «А-студио» старога ўзору («Шаг за шагом»). Дзе сярод гэтай нуднай шэрасці песня-візітоўка, дзеля якой звычайна задумваюцца падобныя праекты? Толькі не кажыце, што гэта вусціш кшталту «Электронны мача».

## Stëkla



Из точки А, Go-Records, 2008

**Някепская мова і неймаверная энергетыка.**

Нетаропкае Intro цяпер у модзе сярод альтэрнатыўнікаў. Магілёўскі гурт таксама пачынае з вязкага найгрыша. Далейшыя скавытанні ды наракання на жыццё (песні «Бред», «Стон») неяк зусім не настройваюць на добры лад. Сумна гэта ўсё ды неарыгінальна. Але з кожным наступным трэкам Stëkla ўсё больш адкрываюцца. Добры і прыемны нумар «Шаги», дзе вакалістка напоўніцу дэманструе свае вакальныя магчымасці, а музыкі сведчаць, што яны ведаюць, як ствараць суперскія балады (слушна — трэба скрыпачку з віяланчэллю прыцягнуць). Цудоўнае двухгалоссе ў беларускамоўным трэку «Да сэрца»: някепская мова і неймаверная энергетыка (Маўзер просіцца на бэк!). «Бездна» — пэўна, самая запамінальная кампазіцыя з дыску, той выпадак, калі хочацца зрабіць музыку гучней. Апошні цвік — «Почему» — стыльненька і запамінальна ды яшчэ з этнічным прысмакам. У каманды можа быць вялікая будучыня! На гэтым трэба было б скончаць, але музыкі, відаць, вырашылі дабіць альбом восьмым трэкам-бонусам. І ўсё сапсавалі малавартым музычным жартам пра шмаль і піва.

**Сяргей Будкін**

## ЗДЫМКІ ГОДУ

**На выбарах у палату прадстаўнікоў нечакана перамаглі ўсе тыя, каму трэба. На фота: галасуюць салдаты сталічных часцей.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Хіндзі-беларусі, пхай-пхай!



ПАВАЛ КАСЦЮКЕВІЧ

Няважна, ці вы праваслаўны, каталік, пратэстант, уніят або юдэй: у павільёне Нацыянальнага выставачнага цэнтру Бэлэкспа (Купалы 27) вы маеце магчымасць прабавіць свае зімовыя святы ў індыйскім стылі.

Штогод у павільёне ладзіцца кірмаш тавараў з Індыі. Тут і пярэстыя тканіны, і вышытыя кашулі ды сукні, і пярсцёнкі з натуральным каменнем (ручная работа, місіс!), а таксама разьбяныя шкатулкі і, вядома, слонікі. А яшчэ наўпрост з далёкае паўвыспы: сандалавыя пахошчы і аўтэнтычная гарбата. Публіку час ад часу цешаць танцоўшчыкі ў традыцыйных апранахах.

Індусы надзвычай усмешлівая нацыя, і, можа, таму цэны на кірмашы збольшага таксама смешныя. У дадатак ахвочыя запрашаюцца таргавацца — тут вам не Еўропа.

Уваход на кірмаш у залежнасці ад настрою касірак ад 1000 да 1500 рублёў. Кірмаш працягнецца да 31 студзеня. Шчыра welcome to India!

**ЛК**

## ВЫСТАВЫ

**Сталая экспазіцыя магнацкіх партрэтаў у Мастацкім**

**У Нацыянальным мастацкім музеі** адкрылася новая сталая экспазіцыя адрэстаўраваных партрэтаў XVI—XVIII стагоддзяў з калекцый Радзівілаў, Агінскіх, Завішаў, Вішнявецкіх і другіх слынных вялікалітоўскіх родаў.

**Прэзентацыя Радзівілаўскай карты ў Нацыянальным гістарычным**

**Нацыянальны музей гісторыі і культуры** прэзентаваў публіцы легендарную мапу Вялікага Княства Літоўскага — шэдэўр XVII ст. Мапу падарыў музею Белзнешэканамбанк, набыўшы яе ў прыватнага калекцыянера.

**Калядная зорка**

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (пл.Кастрычніцкая, 1) да 17 студзеня** працуе выстава «Калядная зорка». Такі зімовы падарунак для наведнікаў выставы падрыхтавалі студэнты і выпускнікі Універсітэту культуры і мастацтваў, а таксама Педагагічнага універсітэту.

**Калядныя ўзоры**

**У бібліятэцы імя Пушкіна (Гікалы, 4) да 20 студзеня** працуе выстава «Калядныя ўзоры», на якой можна ўбачыць вырабы з саломкі, бісеру, скуры і лазы, бяросты, а таксама вышыванне, ткацтва і выцінанку.

**Рэмінісцэнцыі**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 31 снежня** працуе выстава беларускага мастака Уладзіміра Канцадайлава «Рэмінісцэнцыі. Па хвалях маёй памяці». Гэты праект — «сад камянёў», сабраных творцам на працягу многіх гадоў, адлюстраванне самых яскравых уражанняў і суструэчаў.

**Запаветныя жаданні**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва да 10 студзеня** працуе выстава аўтарскіх лялек «Запаветныя жаданні». Вас чакаюць сустрэчы з Дзедамі Марозамі, эльфамі, загадкавымі венецыянскімі маскамі.

**Кітай: 30 градусаў паўночнай шыраты**

**У Музеі гісторыі і культуры Беларусі (Маркса, 12) да 1 лютага** працуе выстава «Кітай: 30 градусаў паўночнай шыраты».

**Традыцыя і сучаснасць**

**У Музеі гісторыі і культуры Беларусі да 4 лютага** працуе выстава беларускага скульптара Аляксандра Батвіненкі «Традыцыя і сучаснасць».

**Беларускія жывёлкі**

**У арт-галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасці, 43) да 31 снежня** працуе выстава «Беларускія жывёлкі». Гэты праект, на думку аўтараў, з'яўляецца адлюстраваннем стану мастацтва Беларусі. Недастатковае фінансаванне дзяржавай розных формаў выяўленчага мастацтва вядзе да паніжэння ўзроўню культуры і адсутнасці мастацкага густу ў значнай часткі грамадства.

**Карнавал**

**У Мастацкім музеі (Леніна, 20) да 12 студзеня** працуе жывапісная выстава твораў Андрэя Смаляка «Карнавал», на якой экспануецца каля ста твораў мастака.

## КАНЦЭРТЫ

**Карнавал**

**31 снежня ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — Навагодні rock&retro карнавал. **Пачатак а 22-й.**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатр**

**30 (аўт)** — «Паўлінка»
**2 (пт), 3 (сб)** — «Ядвіга»
**4 (ндз), 8 (чц)** — «Паўлінка»
**5 (пн)** — «КІМ»
**9 (пт)** — «Івона, прынцэса Бургундская»
**10 (сб)** — «Сны аб Беларусі»
**11 (ндз)** — «Чорная панна Нясвіжу»

*ранішнія спектаклі*

**29 (пн), 30 (аўт)** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**4 (ндз)** — «Паўлінка»
**5 (пн)** — «Снежная каралева»

*малая сцэна*

**27 (сб), 28 (ндз)** — «Дамскае танга»
**5 (пн)** — «Адчыніце кантралёру!»
**9 (пт)** — «Беларусь у фантастычных апавяданнях»

## АБВЕСТКА

**Творчы конкурс «Дзеяслова»**

Часопіс «Дзеяслоў» абвяшчае конкурс літаратурна-крытычных твораў на тэму: «Беларуская літаратура XXI стагоддзя: пастаці, тэндэнцыі, перспектывы».

Да конкурсу прымаюцца літаратурна-крытычныя артыкулы, эсэ, рэцэнзіі, якія асвятляюць сучасны літаратурны працэс. Да ўдзелу запрашаюцца маладыя крытыкі і літаратуразнаўцы, якія пішуць на беларускай мове.

Для пераможцаў конкурсу будзе зладжаны семінар з майстар-класамі вядомых беларускіх літаратараў і крытыкаў.

Па выніках конкурсу будзе выдадзеная кніга.

Склад журы конкурсу: Міхась Тычына, Алесь Пашкевіч, Сяргей Дубавец, Ірына Шаўлякова, Анатоль Івашчанка.

**Тэрмін падачы твораў: з 1 верасня 2008 г. да 1 лютага 2009 г. Дасылаць творы можна ў электронным (пажадана) ці рукапісным выглядзе на адрасы: dzieja-konkurs@tut.by альбо 220025, г. Менск-25, а/с 91 з пазнакай «для конкурсу».**

Дзейнічайце!

# Каляды ў Бараўлянах

**У Дзіцячым анкалагічным цэнтры, што ў Бараўлянах 23 снежня прайшоў дабрачынны калядны канцэрт.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Цягам двух папярэдніх тыдняў кожны ахвотны мог выбраць імя дзіцяці са спісу, размешчанага на сайце ініцыятывы help-me.by, ды зрабіць яму навагодні падарунак. Сваіх маленькіх уладальнікаў знайшлі больш за 500 падарункаў, клапатліва запакаваных і падпісаных рукамі ахвярадаўцаў.

У святочным канцэрце узялі ўдзел фокуснік Пётр Стасевіч, клоўны Кася і Рудая, Ганна Клэр і лялька Гарык ад NETradio, а для бацькоў, якія жывуць са сваімі дзецьмі ў Бараўлянах, падарункам стаў выступ спявачкі Вольгі Плотнікавай, Віталя Артыста («beZbileta») ды Пятра Ялфімава.

Тых жа дзяцей, якія з тых ці іншых прычын не змаглі прыйсці на канцэрт артысты разам з сапраўдным Дзедам Марозам павіншавалі проста ў палатах. Многія дзеці старанна рыхтаваліся да прыезду Дзеда Мароза, сустрэлі яго вершыкамі і ўзаемнымі падарункамі.Некаторыя дзеткі, якія былі згаданыя ў спісах, на шчасце, змогуць сустрэць Новы год дома, сярод родных і блізкіх. Падрыхтаваныя для іх падарункі будуць чакаць сваіх гаспадароў у цэнтры.

Дзякуючы вялікаму запасу «неімянных» падарункаў, удалося павіншаваць і тых 70 дзяцей, якія толькі паступілі ў цэнтр. Без падарункаў не засталося ніводнае дзіця. Маленькім насельнікам цэнтра, таксама як і іх бацькам, было вельмі прыемна, што пра іх думаюць і клапоцяцца.

**Уладзіслаў Бартноўскі, ініцыятыва help-me.by**




Капітан Танака © www.tanaka.by

# «Белсат»: тэлепраграма на 29снежня — 7 студзеня
# «Белсат» — гэта незалежны беларускі спадарожнікавы тэлеканал

## 29 снежня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Ранча», серыял, 6 серыя
**19.00** «Пяцёра дзетак і Пескавік» (Five Children and it), рэж. Джон Стывенсан (John Stephenson), 2004 г., Вялікая Брытанія—ЗША.
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** «Каляды, Каляды», ч. 1, 2007 г., Польшча
*Беларускія музычныя зоркі співаюць традыцыйныя і сучасныя калядныя песні.*
**21.45** «Аблічча смерці» (Facing the Dead), дак. фільм, рэж. Карл Людвіг Рэтынгер (Carl Ludwig Rettinger), Габрыеле Пфайфэр (Gabrielle Pfeiffer), 2005 г., Германія—Расія
**22.35** Жаўтуха
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 1 серыя
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

**30 снежня, аўторак**

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 1 серыя
**18.50** «Эстонія, маё каханне», маст. фільм, рэж. Сібіле Тыдэман (Sybille Tiedemann), 2004 г., Германія.
**20.25** Рэпарцёр
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** «Журналісты», дак. фільм, 2007 г., Польшча
*Беларусь — не першая краіна ў Еўропе, дзе ўлады вяртаюцца да традыцыяў савецкае мінуўшчыны, ідучы ў кірунку, які цяжка сёння назваць цывілізаваным. На беларускіх журналістах практыкаваліся ўсе магчымыя злачынныя метады, якія толькі можна сабе ўявіць...*
**22.00** Еўропа сёння
**22.25** Таўкачыкі на Божае Нараджэнне, ч. 1
**22.45** «Першы дзень», дак. фільм, рэж. Марцін Саўтэр (Marcin Sauter), 2008 г., Польшча
**23.05** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 2 серыя
**23.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

## 31 снежня, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 2 серыя
**18.55** Праект «Будучыня»: навуковы агляд каналу «Нямецкая хваля»
**19.25** Бульбаны
**19.40** «Крыніца» (Zdryj), дак. фільм, рэж. Марцін Марэчэк (Martin Marecek), 2005 г., Чэхія
*Лічыцца, што Азербайджан належыць да тых краінаў свету, што развіваюцца найбольш хуткімі тэмпамі. Але як там жывецца простым людзям?*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** «Падарожжа ў прэрыі» (A Prairie Home Companion), маст. фільм, рэж. Роберт Олтмэн (Robert Altman), 2006 г., ЗША
*Пасля 32 гадоў існавання ў горадзе Сэйнт-Пол (штат Мінесота) радыёстанцыю WLT прадаюць тэхаскай фірме. Спыняецца трансляцыя найпапулярнейшага на гэтай хвалі шоу — «Падарожжа ў прэрыі». У дажджлівую суботу праграма з удзелам фанаў будзе наўпрост трансляваца з тэатру Сэйнт-Полу. Гледачы, аднак, не будуць ведаць, што гэта іх развітанне з «Падарожжам у прэрыі», а іх любімыя зоркі выступаюць для іх апошні раз.*
**23.00** Навагодні канцэрт «Снежны завулак»
**00.05** «Агент 117: місія ў Каіры» (OSS 117: Le Caire nid d'espions), маст. фільм, рэж. Мішэль Хазанавічус (Michel Hazanavicius), 2006 г., Францыя
*Супер-хіт пра французскага Джэймса Бонда — агента OSS 117 — рэпрэзэнтуе іранічны погляд французаў на свае ўласныя хібы.*
**01.40** Навагодні канцэрт, ч. 1
**02.05** Навагодні канцэрт, ч. 2

## 1 студзеня, чацвер

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** Навагодні канцэрт «Снежны завулак»
**19.10** «Абелікс і Астэрыкс супраць Цэзара» (Asterix et Obelix contre Cesar), маст. фільм, рэж. Клод Зідзі (Claude Zidi), 1999 г., Францыя—Германія—Італія. У ролях: Жэрар Дэпард'ё (Gerard Depardieu), Крыстыян Клавіе (Christian Clavier).
*Экранізацыя вядомага французскага коміксу. Дзеянне адбываецца ў I ст. да н. э.*
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** «Незвычайныя суседзі» (Niezwykli sasiedzi), рэпартаж, 2008 г., Польшча
*Мікалай Тарасюк — апошні жыхар калісьці вялікай вёскі Стайлы, што на Пружаншчыне (Брэсцкая вобласць). Спусцелыя гароды ён засяліў выразанымі з дрэва постацямі людзей, падобнымі на тых, хто калісьці тут жыў. Часамі ён выбіраецца ў вёску, каб паразмаўляць са сваімі фігурамі, суседзямі, што ўжо адышлі ў нябыт.*
**21.45** Бульбаны
**22.00** «Уцёкі» (La Carapate), маст. фільм, рэж. Жэрар Уры (Gerard Oury), 1978 г., Францыя. У галоўнай ролі П'ер Рышар (Pierre Richard).
*Парыжскага адваката Дзюрока падчас наведвання злачынцы бяруць у закладнікі. Дзюрок становіцца нявольным падзельнікам уцекача з вязніцы, дзе ў гэты час адбыўся бунт. Сітуацыя ўскладняецца тым, што прэса ведае пра левыя погляды адваката і робіць высновы, што менавіта Дзюрок і стаў арганізатарам ды кіраўніком бунту. На вуліцах Францыі 1968 г. не вельмі бяспечна...*
**23.40** «Мы вольныя людзі» (My wolni ludzie), дак. фільм, рэж. Пётр Стэц (Piotr Stec), Томаш Марцінец (Tomasz Morciniec), 2008 г., Польшча
*Зорка беларускай рок-сцэны гурт N.R.M. едзе ў невялікую вёску Бескіды пад славацкую мяжу, дзе яшчэ жывыя гуральскія музычныя традыцыі. Рок-песні N.R.M. гучаць у арыгінальнай апрацоўцы з выкарыстаннем традыцыйных гуральскіх інструментаў: фідля, басэтлі і трэмбітаў...*
**00.40** Жаўтуха

## 2 студзеня, пятніца

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Мы вольныя людзі» (My wolni ludzie), дак. фільм, рэж. Пётр Стэц (Piotr Stec), Томаш Марцінец (Tomasz Morciniec), 2008 г., Польшча
**19.05** Праект «Будучыня»: навуковы агляд (канал «Нямецкая хваля»)
**19.35** «Чацвёртая сусветная вайна» (The Fourth World War), дак. фільм, рэж. Рык Роўлі (Rick Rowley), 2003 г., ЗША
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Госць «Белсату»: Міхал Анемпадыстаў
**21.35** «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара» (Asterix et Obelix contre Cesar), маст. фільм, рэж. Клод Зідзі (Claude Zidi), 1999 г., Францыя—Германія—Італія. У ролях: Жэрар Дэпард'ё (Gerard Depardieu), Крыстыян Клавіе (Christian Clavier).
**23.20** «Пітбуль», серыял, 7 серыя




**00.10** Аб'ектыў (навіны)

## 3 студзеня, субота

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода»
**18.40** «Закаханыя ў Мінску», дак. фільм, рэж. Ульф фон Мэхаў (Ulf von Mechow), 1994 г., Германія
**20.10** Беларусы ў Польшчы
**20.30** Кружэлка (сусветная музыка)
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Віртуальная помпа: агляд Сеціва
**21.35** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**22.05** «Ямы» (Holes), маст. фільм, рэж. Эндру Дэйвіс (Andrew Davis), 2002 г., ЗША
*Падлетак Стэнлі становіцца ахвяраю старога сямейнага праклёну. Несправядліва асуджаны, ён трапляе ў папраўчы лагер...*
**00.00** Аб'ектыў (навіны)

## 4 студзеня, нядзеля

**18.00** Прэс-экспрэс
**18.15** «Ранча», серыял, 7 серыя
**19.05** Жаўтуха
**19.30** «У пошуку ідышу», дак. фільм, рэж. Юры Хашчавацкі, 2008 г., Беларусь
*Ці захаваліся ў сучаснай Беларусі рэшткі габрэйскай культуры? Ці засталіся яшчэ дзе-небудзь сведчанні разбуранай гісторыі габрэйскага народу ў Беларусі? У фільме выкарыстоўваюцца архіўныя матэрыялы.*
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня)
**21.20** Ток-шоу «Форум»: Б'е — значыць любіць? Хатні гвалт.
**22.05** «Мядзведзік» (Medvedek), маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк (Jan Hrebejk), 2007 г., Чэхія. У ролях: Іржы Махачэк (Jire Machacek), Роман Лукнар (Roman Luknar), Іван Траян (Ivan Trojan), Наташа Бур'ер (Natasa Burger). Зузана Фіялава (Zuzana Fialova), Анна Гейслерава (Anna Geislerova), Клара Ісава (Klara Issova).
**23.45** Бульбаны
**23.55** Аб'ектыў (вынікі тыдня)

## 5 студзеня, панядзелак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Ранча», серыял, 7 серыя
**19.05** «Крыніца» (Zdroj), дак. фільм, рэж. Марцін Марэчэк (Martin Marecek), 2005 г., Чэхія
**20.25** Тыдзень з радыё «Свабода»
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** «Мядзведзік» (Medvedek), маст. фільм, рэж. Ян Гржэбэйк (Jan Hrebejk), 2007 г., Чэхія
**23.00** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 3 серыя
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**00.05** Аб'ектыў (навіны)

## 6 студзеня, аўторак

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 3 серыя
**18.55** «Пакутнікі», дак. фільм, 2003 г., Літва
**19.55** Еўропа сёння: тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»
**20.25** «Каляды, Каляды», ч. 2, 2007 г., Польшча
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.15** Госць «Белсату»: Міхал Анемпадыстаў
**21.40** «Неверагодны лёс Амелі Пулен» (Le fabuleux destin d'Amelie Poulain), меладрама, рэж. Жан-П'ер Жанэ (Jean-Pierre Jeunet), 2001 г., Францыя. У галоўных ролях Адры Тату (Audrey Tautou) і Мат'ё Касавіц (Mathieu Kassovitz).
*Адзін з самых паспяховых кінапраектаў сучаснай Францыі, які нарадзіў процьму пераймання і ўзгадаваў натоўпы фанатаў, што дагэтуль б'юцца над таямніцамі фільму.*
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы
**23.55** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 4 серыя
**00.45** Аб'ектыў (навіны)

## 7 студзеня, серада

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне)
**18.10** «Элі Макбіл», тэлесерыял: III сезон, 4 серыя
**19.00** Праект «Будучыня»: навуковы агляд (канал «Нямецкая хваля»)
**19.30** Рэпарцёр
**20.00** «Народны альбом», мюзікл, рэж. Міхал Анемпадыстаў, 1999 г., Беларусь. Спяваюць: Кася Камоцкая, Вераніка Круглова, Зміцер Вайцюшкевіч, Лявон Вольскі ды інш. Напоўнены іроніяй і жартамі музычны фільм, у якім апавядаецца пра заходнебеларускае мястэчка 1920—1930-х.
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне)
**21.20** «Вызваленне», ч. 1, дак. фільм, рэж. Вольга Нікалайчык, 2008 г., Беларусь
**22.00** «Фанфан-Цюльпан» (Fanfan la Tulipe), маст. фільм, рэж. Жэрар Краўчык (Gerard Krawczyk), 2003 г., Францыя. У ролях: Вэнсан Пэрэс (Vincent Perez), Пенелопа Крус (Penelope Cruz), Дыд'е Бурдон (Didier Bourdon).
*Новая версія прыгодаў Фанфана-Цюльпана, прадзюсерам якога выступіў Люк Бесон. Першая версія «Фанфана-Цюльпана» была самым касавым фільмам 1950-х.*
Падзеі стужкі адбываюцца ў Францыі XVIII ст. — за часоў панавання караля Людовіка XV. У фільме расказваецца пра маладога, вельмі прывабнага, але беднага хлопца Фанфана, які, каб не жаніцца, уцякае ў войска. У дарозе цыганка яму варожыць, што, калі ён пойдзе служыць, то аднаго дня пабярэцца шлюбам з дачкою самога караля!..
**23.40** «Таўкачыкі на Калядах», частка 2
**00.00** «Мент», дэтэктыўны серыял, 8 серыя
**00.55** Аб'ектыў (навіны)

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** Тое ж, што статак. **4.** Прыйшло з Італіі. У нас было «віленскае». **7.** Не кенгуру, а з сумкай. Жыве ў ЗША і Бразіліі. **13.** Апошняя беларуская станцыя на чыгунцы Віцебск–Невель. **14.** Мой мілы ..., мой лётчык... **15.** Вёска на беразе Мінскага мора. **16.** Савецкі музыка, стваральнік і кіраўнік вакальна-інструментальнага ансамблю «Поющие сердца» і групы «Ария». **17.** У Старажытным Рыме — пульманорыя. У нас — ... **20.** Казахскі паэт і празаік, народны пісьменнік Казахстану. **22.** Былая вёска і будучы жылы раён у Мінску. **25.** Заснавальнік расійскага «Сатырыкону». **28.** Клінічны сіндром, на які пакутаваў Гулівер. **32.** Курорт у Харватыі. **33.** Два драты з розных металаў, спаяныя ў адной кропцы. Выкарыстоўваюцца для вымярэння тэмпературы. **36.** Памежная з Украінай вёска ў Драгічынскім раёне, на ўскрайку балот. **39.** Філіпінскі Каліноўскі XX ст. **40.** Месца, дзе коней не мяняюць. **41.** Заслужаны дзеяч культуры Беларусі, аўтар «Кацюшы». **44.** «Кароль барытону», «маэстра бельканта» — славуты італьянскі спявак пачатку XX ст. **46.** Джавахарлал ... **47.** Школьны прадмет, па якім «нездавальняюча» атрымаць — гэта трэба пастарацца. **51.** Беларускі жаночы вакальны ансамбль. **55.** Паплечнік Кромвеля. Яшчэ так звалі адмоўнага персанажа ў кнігах Жуля Верна. **56.** Аўстралійская народная зброя. **59.** Бывае ў аэрапорце. Бывае нафтавы. **65.** Складнік клеткі жывога арганізму. **66.** Чалавек і праліў, вакол свету абплыў. **67.** Горад савецкіх нявест. **68.** Німфаманія ў мужчынаў. **69.** Парыжскі беспрытульны. **70.** Працоўны калектыў карабля. **71.** Застолле, вечарына.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** Рэвалюцыйны рух англійскіх рабочых. **2.** Стыхійнае бедства, звычайнае для Палесся. **3.** Вынаходнік неўміручасці ў п'есе Кандрата Крапівы. **5.** Самы паўночны штат ЗША. **6.** Казачны персанаж. Вялікі сябар Бабы Ягі. **8.** Тое, чым прываблівающь. **9.** Радзіма Хаіма Суціна. **10.** Экстравагантны расійскі спявак, якому прапаноўвалі прадстаўляць Беларусь на Еўрабачанні ў 2009 г. **11.** Камуна ў раёне Баўтцэн зямлі Саксонія ФРГ. **12.** Кампазітар, аўтар оперы «Воўчая зграя». Яго цёзка — аўтар «Палёту валькірый». **18.** Прыток Шчары. **19.** Старажытная цытадэль у цэнтры Бухары. **20.** Жыве ў Гімалаях, ходзіць босы. Пакідае на снезе сляды 50-га памеру. **21.** Найменшы індыйскі штат, на ўзбярэжжы Аравійскага мора. **23.** Смачны ёй арэх, ды зубоў Бог не даў. **24.** Ляснік з паляўнічым ухілам. **25.** У Старажытных Афінах — выгнанне з гораду асобных грамадзян паводле рашэння народнага сходу. **26.** Беларуская спявачка, салістка ансамблю народнай музыкі «Бяседа». **27.** Баскетбольны аналаг НХЛ. **29.** Ладны адрэзак часу. **30.** Яго сталіца — Казань. **31.** Младатуркі, младачэхі, ... . **34.** Астраўная дзяржава ў Ціхім акіяне, свабодна асацыяваная з ЗША. **35.** «... бяззбройны і бясспрэчны» (У.Караткевіч) **37.** Важак ваўкоў, які прамахнуўся. **38.** Той, хто ідзе за плугам. **42.** Працістаўленне яве. **43.** Тонкі слой ледзяных крышталёў, які ўтвараецца на ахаладжанай паверхні. **44.** Горад у Кіеўскай вобласці ва Украіне, а таксама штосьці гучнае і бурлівае, што ўзнімаюць. **45.** Бык, у гонар якога нашы продкі назвалі горад. **48.** Беларускі мовазнавец, доктар навук, укладальніца «Украінска-беларускага слоўніка». **49.** Паўднёваамерыканская атрутная жаба. **50.** Нага, толькі без «а». **52.** Дзяржаўны тэлеканал. **53.** Расце на балотах, водмелях рэк, азёр. Трапіў да нас з татарамі. **54.** Быццё, наяўнасць. **56.** Жалезны канцлер Германскай імперыі. **57.** Рухавік гандлю. **58.** Нямецкі фізік і фізікахімік, які сфармуляваў трэці закон тэрмадынамікі. **60.** Працілегласць альтруізму. **61.** Гістарычная вобласць у чэшска-славацкім памежжы, калыска чэшскай дзяржавы. **62.** «..., горная ...». **63.** Прадукцыя шаўца. **64.** Ралля.

**Склаў**
**Сяргей Петрыкевіч**



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: **1.** Чарада. **4.** Барока. **7.** Апосум. **13.** Езярышча. **14.** Таварыш. **15.** Ганалес. **16.** Векштэйн. **17.** Медуніца. **20.** Ергалієў. **22.** Ржавец. **25.** Аверчанка. **28.** Гігантызм. **32.** Бале. **33.** Тэрмапара. **36.** Радастава. **39.** Агінальда. **40.** Пераправа. **41.** Ісакоўскі. **44.** Батыстыні. **46.** Нэру. **47.** Маляванне. **51.** «Чараўніцы». **55.** Айртан. **56.** Бумеранг. **59.** Тэрмінал. **65.** Рыбасома. **66.** Магелан. **67.** Іванава. **68.** Сатырыяз. **69.** Клашар. **70.** Экіпаж. **71.** Бяседа.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: **1.** Чартызм. **2.** Разводдзе. **3.** Дабрыян. **5.** Аляска. **6.** Кашчэй. **8.** Прынада. **9.** Смілавічы. **10.** Майсееў. **11.** Нешвіц. **12.** Вагнер. **18.** Іса. **19.** Арк. **20.** Еці. **21.** Гоа. **23.** Жаба. **24.** Егер. **25.** Астракізм. **26.** Раманская. **27.** Ноа. **29.** Год. **30.** Татарстан. **31.** Младафіны. **34.** Палаў. **35.** Радок. **37.** Акела. **38.** Араты. **42.** Сон. **43.** Іней. **44.** Буча. **45.** Тур. **48.** Лемцюгова. **49.** Ага. **50.** Наг. **52.** АНТ. **53.** Аер. **54.** Існаванне. **56.** Бісмарк. **57.** Рэклама. **58.** Нернст. **60.** Эгаізм. **61.** Маравія. **62.** Лаванда. **63.** Абутак. **64.** Ворыва.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


**ВІТАННІ**

**Паўночныя афінцы** з Залесся князя Агінскага віншуюць з Калядамі князя Бенедыкта Завішу з Парыжу! Люда, Станіслаў, СэрВожык, Дар'я

**НОВЫГОДУГОМЕЛІ**

**Святы Мікалай** і яго сябры віншуюць Вас і Вашых дзетак з Калядамі і Новым годам! Песні, танцы, гульні, загадкі. Весела, яскрава, па-беларуску. Т.: (029) 329-61-96, 029-656-22-29


Прыватныя абвесткі ў «НН» (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Правыя дэпутаты робяць запрос. Яны патрабуюць, каб урад выгнаў вон суддзяў, каторыя цягнуць да левых партый. Міністр юстыцыі адказвае, што ў судзе няма партый, а суддзі павінны судзіць толькі па сумленні. Пурышкевіч (камандзір канцавых правых) крычыць: «Ваша Высокаправасхадзіцельства, я вам зараз прачытаю па запісцы ўсіх суддзяў-крамольнікаў».

**«Наша Ніва». №26 ад 18 снежня 1908**

**Шаноўныя чытачы!**

Наступны нумар «НН» выйдзе 8 студзеня 2009 году. Вясёлых Вам святаў! Да сустрэчы ў новым годзе!



**Міліцыя з Марозам! Пад такім лозунгам пачаліся Каляды на мінскіх вуліцах. Пераапранутыя Дзядамі Марозамі інспектары ДАІ спынялі аўтааматараў і... віншавалі з святамі.**

PHOTO.BYMEDIA.NET


**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выдання газеты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 5048. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 28.12.2008.
Замова № 7161.
ISSN 1819-1611
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12